СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск—5.05, 21.25, 16.20;
Віцебск—4.49, 21.22, 16.33;
Магілёў—4.55, 21.14, 16.19;
Гомель—5.01, 21.03, 16.02;
Гродна—5.23, 21.37, 16.14;
Брэст—5.30, 21.32, 16.02.

МЕСЯЦ:
Поўня 14 ліпеня.

ІМЯНІНЫ:
Панкрата, Кірыла, Аляксандра, Хведара.

ЗВЯЗДА

22 ЛІПЕНЯ 1992 г.
серада, № 145 (21923)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

ВОЗГАЛАС

АБ ПЕРШЫХ ПАРТЫЯХ:

сапраўдных рублёў

З крыніц, блізкіх да кіраўніцтва Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, стала вядома, што ў канцы ліпеня ў рэспубліку прыбудзе першая партыя купюр вартасцю 5 тысяч рублёў на агульную суму 2 мільярды. Гэтыя грошы з 15 ліпеня пачалі распаўсюджвацца ў самой Расіі і вось, нарэшце, пачнуць паўнапраўнае жыццё на Беларусі. Так што цяпер не здзіўляйцеся, калі вы атрымаеце зарплату толькі адной расійскай «паперкай».

несапраўдных талераў

Некалькі дзён назад па Мінску папаўзлі чуткі аб тым, што нібыта два вагоны Нацыянальнага банка РБ накіраваліся ў Германію за першай партыяй новых нацыянальных беларускіх грошай — талераў. «Дасведчаныя» людзі сцвярджалі, што адразу пасля прыбыцця талераў у Мінск пачнецца абмен іх на расійскія рублі ў адносінах 1:10. Таму быццам бы трэба як мага хутчэй траціць апошнія. Чуткі, як заўсёды, аказаліся крыху перабольшанымі. Як удалося высветліць карэспандэнту «Звязды», на момант іх узнікнення абодва вагоны Нацыянальнага банка РБ спакойна стаялі на вакзале, а потым, напоўненыя струхлелымі грошамі, накіраваліся ў Маскву, адкуль прывезлі чарговую партыю рублёў.

ЕСЦІ Ж ХОЧАЦЦА

У рэдакцыю звярнулася група рабочых Краснапольскага камбіната будаўнічых матэрыялаў. Яны ўжо 4 месяцы не атрымліваюць зарплаты. Ніякіх дакладных тлумачэнняў адміністрацыя прадпрыемства даць не можа. Магчыма, пытанне вырашаецца з завозам новых пяцітысячных купюр з Расіі?

ПРАМАЯ ЛІНІЯ

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Станіслаў ШУШКЕВІЧ

адкажа на пытанні чытачоў «Звязды»

Станаўленне рэальнага суверэнітэту Беларусі. Прызнанне яе сусветным супольніцтвам. Крызіс у эканоміцы. Магчымасці сацыяльнай абароненасці насельніцтва пры пераходзе да рынку. Рост нацыянальнай самасвядомасці і развіццё міжнацыянальных адносін у рэспубліцы. Усталяванне дзяржаўнасці беларускай мовы. Перспектывы СНД і роля ў іх Беларусі. Узаемаадносіны РБ з далёкімі і блізкімі суседзямі, і як гэта адбіваецца на лёсе беларускай дыяспары. Адраджэнне Беларускага войска. Магчымасць рэферэндуму і сітуацыя ў рэспубліцы.

Гэтыя і многія іншыя праблемы, як сведчыць пошта «Звязды», хвалююць жыхароў рэспублікі. А што думае наконт гэтага Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. С. ШУШКЕВІЧ?

У чацвер, 23 ліпеня, з 15 да 16 гадзін ён чакае вашых пытанняў. Задаваць іх вы зможаце таксама тэрміновай тэлеграмай ці пісьмом. Званіце па тэлефонах: 32-38-21; 32-51-05.

Запіс «прамой лініі» будзе апублікаваны ў «Звяздзе».

Уладзімір ЖАЛІБА:

«ХАЧУ БЫЦЬ ПАСЛОМ ДАБРА»

Вуліца Трактарная, 3. Па гэтаму адрасу ў гасцініцы Міністэрства абароны РБ размясцілася рэзідэнцыя надзвычайнага і паўнамоцнага пасла Украіны ў Рэспубліцы Беларусь Уладзіміра Жалібы.

— Уладзімір Іванавіч, што адчувае чалавек, удастоены высокага гонару быць паслом сваёй радзімы ў іншай краіне?

— Як ні банальна гэта гучыць — хваляванне і вялікую адказнасць, а калі быць шчырым, той і задавальненне. Гісторыя робіць крутыя павароты. У інтэрнаце мы з вамі ўжо нажыліся. Сусветны вопыт паказаў, што вялікія рэзервы тут звязаны з рэалізацыяй ідэі нацыянальнай незалежнасці. Вызваліць нашы традыцыйныя сувязі ад пустых лозунгаў і дэкларацый, каб напоўніць іх канкрэтным зместам, — вось што цяпер самае галоўнае. Я вельмі люблю Беларусь. Для мяне, сапраўды, высокі гонар жыць разам з таленавітым, працавітым і добрасардэчным беларускім народам. Мне вельмі хацелася б быць паслом Дабра.

— Што раней звязвала асабіста вас з нашай рэспублікай?

— Родам я з Чарнігаўшчыны, у якой з Беларуссю адносіны асаблівыя. Як вядома, гэта вобласць — галоўны пастаўшчык бульбы на Украіне. Мы абменьваліся з Гомельшчынай лепшымі сартамі і, нагул, усяляк стараліся адзін аднаму дапамагчы. Мы ганарыліся брацкімі сувязямі прадпрыемстваў, калгасаў, сем'яў. Мы думалі пра вялікае, калі ўзвышалі Манумент дружбы на стыку земляў Гомельскай, Бранскай і Чарнігаўскай абласцей — там, дзе, як тады гаварылі, «певень пяе на тры рэспублікі». Напэўна, быў у гэтых адносінах лішак лозунгаў і медзі аркестраў. Але рабілася ўсё гэта шчыра. Мяркую, мы павінны захаваць усё лепшае з нашага мінулага і адкінуць усё наноснае. Акрамя таго, я, можна сказаць, кроўна звязаны з Беларуссю: у нашым родзе ёсць і беларуская кроў.

— Пан пасол, раскажыце крыху пра сябе. Вы прысутнічаеце ў якой-небудзь партыі?

— Нарадзіўся 24 лютага 1934 года, украінец. Закончыў сельгасінстытут і Акадэмію грамадскіх навук. Працоўны шлях пачаў аграномам у Цярнопальскай вобласці. Там «дапрацаваўся» да першага намесніка старшыні аблвыканкома. Быў на партыйнай рабоце. З 1980 года — старшыня выканкома абласнога Савета народных дэпутатаў, старшыня абласнога Савета ў Кіраваградзе. Народны дэпутат Украіны, член камісіі Вярхоўнага Савета Украіны. Жанаты, двое дарослых дзяцей. Жонка пакуль яшчэ ў Кіраваградзе, але, як толькі быт крыху ўладкуецца, вядома, прыедзе сюды.

Што датычыцца партый — быў членам Кампарты Украіны. Сёння, пасля вядомых падзей, ні ў якія партыі «не цягне», хоць я ў прынцыпе — за шматпартыйнасць, за супрацоўніцтва ўсіх сіл грамадства на ўзаемапрымальнай аснове.

— Відаць, вы асабіста ведаеце пана Краўчука...

— Леаніда Макаравіча я даўно і добра ведаю. Шчыра гавару: гэта неардынарная асоба. Мае рознабаковыя веды. Лёгкі ў зносінах, настойлівы ў адстойванні сваёй пазіцыі. У цэлым — гэта гібкі і тонкі палітык, гарачы змагар нацыянальнага адраджэння. Такое ўражанне застаецца ў большасці людзей, якія асабіста знаёмыя з ім.

— Пан пасол, на Беларусі рыхтуецца рэферэндум аб роспуску парламента і назначэнні новых выбараў. Ці адбываецца нешта падобнае на Украіне?

— Такое пытанне на сесіях Вярхоўнага Савета падымалася неаднойчы. Але калі год назад яно абмяркоўвалася вельмі актыўна, то сёння прыхільнікаў правядзення рэферэндуму прыкметна паменшала. Большасць дэпутатаў мяркуе, што на Украіне цяпер шмат іншай, стваральнай працы. Хоць, вядома, любыя павароты ў цяперашніх умовах не выключаны.

— Ці можа, на ваш погляд, Украіна выйсці з рублёвай зоны, не чакаючы замежнай дапамогі ў стварэнні стабілізацыйнага фонду купона і грыўны?

— У Вярхоўным Савеце існуюць розныя пункты гледжання. Дамінуючая думка: Украіна павінна выйсці з рублёвай зоны. Калі гэта здарыцца? Залежыць ад многіх абставін, у прыватнасці, ад фінансавай палітыкі Міжнароднага валютнага фонду і Расіі.

— Ці мае намер Украіна ў будучым далучыцца да якога-небудзь ваенна-палітычнага саюза ці стаць нейтральнай дзяржавай?

— Украіна, як і Беларусь, бачыць сваю будучыню ў еўрапейскім супольніцтве, у адзінай сям'і еўрапейскіх дзяржаў. Украіна будзе стабільным і надзейным партнёрам, які захоўвае нормы міжнароднага права. Магу пацвердзіць рашучыя намеры Украіны стаць бяз'ядзернай нейтральнай дзяржавай.

— Пан пасол, якія, на ваш погляд, перспектывы захавання СНД і, з другога боку, стварэння Балтыйска-Чарнаморскага саюза?

— СНД — складанае палітыка-эканамічнае ўтварэнне. Цяпер цяжка сказаць, ці суджана Садружнасці доўгае жыццё, бо яе магчымасці толькі пачынаюць рэалізоўвацца.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

ТАКІ ПРЭЗІДЭНТАБЕЛЬНЫ ПРАЕКТ

Палку прэзідэнтаў папражае папаўненне. На гэты раз ганаровы і, бясспрэчна, паважаны тытул давядзецца «прымерыць» аднаму з вядомых (а можа, і не) беларускіх палітыкаў. Хоць не варта загадваць, бо пакуль што мы маем справу толькі з праектам закона «Аб прэзідэнце Рэспублікі Беларусь», падрыхтаваным рабочай групай, што складаецца з членаў АДПБ, пад кіраўніцтвам кандыдата юрыдычных навук дацэнта М. Чудакова.

Калі звярнуць погляд на аналагічныя законы заходніх краін, дык гэты праект па ідэі бліжэй за ўсё да французскага — так гаворыць дасведчаныя людзі. Але толькі па ідэі: у цэлым жа гэта арыгінальны, самабытны дакумент.

Згодна з праектам, заканадаўчую пасаду зможа заняць чалавек, які дасягнуў 35 гадоў, мае выбарчае права і пражыў у рэспубліцы не менш 10 гадоў. (Да радасці феміністак, пол значэння не мае). Тэрмін знаходжання на гэтай пасадзе — ад 4 да 5 гадоў, але не больш за два тэрміны запар. Кандыдат на пасаду павінен вылучацца грамадзянамі рэспублікі ў колькасці не менш 10 тысяч чалавек, што пацвярджаецца подпісамі, сабранымі ў законным парадку.

Прэзідэнт рэспублікі выбіраецца шляхам усеагульнага прамога і тайнага галасавання і лічыцца перамогшым у выпадку, калі набраў больш за 50 працэнтаў галасоў ад колькасці ўдзельнікаў выбараў.

Народны выбранник, акрамя ўсяго, павінен мець выдатнае здароўе, што кожны год будзе пацвярджацца кампетэнтнай медыцынскай камісіяй, з апублікаваннем бюлетэня ў друку.

У цэлым праект даволі грунтоўны, падыходзіць да такога новага для рэспублікі інстытута. Правы і абавязкі прэзідэнта рэгламентуюцца ў 34 артыкулах дакумента. Што датычыцца яго будучыні, дык яна цалкам залежыць ад цяперашніх дэпутатаў Вярхоўнага Савета Беларусі.

Дзяніс ДЗЕМЧАНКА.
БелаПАН.

БЕЛАРУСЬ — РАСІЯ

ЯК ЖЫЦЬ ПАСЛЯ «РАЗВОДУ»?

Назіраючы працэсы, якія ідуць паміж краінамі СНД, заўважаеш, што «развод» былых рэспублік нечым нагадвае развод у сям'і, калі былыя муж і жонка не хочуць выносіць на свет божы таямніцы свайго сумеснага жыцця, асабліва калі гаворка ідзе пра раздзел маёмасці. Так было і пазаўчора ў маскоўскай гасцініцы «Прэзідэнт», дзе сустрэліся ўрадавыя дэлегацыі Беларусі і Расіі на чале з прэм'ерамі. Размовы вяліся за закрытымі дзвярамі, ніякай пісьмовай інфармацыі для журналістаў, ніводнага дакумента для знаёмства.

Праўда, і беларускі прэм'ер Вячаслаў Кебіч, і расійскі Ягор Гайдар ахвотна адказвалі на пытанні журналістаў і ў час перапынку ў рабоце, і на прэс-канферэнцыі. У чым маглі пераканацца журналісты, дык гэта ў сапраўднай прадукцыйнасці сустрэчы, бо на іх вачах было падпісана 30 дакументаў, з іх 12 на ўзроўні прэм'ераў.

Пытанне з пытанняў — пастаўкі нафты і нафтапрадуктаў у Беларусь з Расіі. У кулуарах удалося высветліць, што бакі змаглі дагаварыцца аб пастаўцы ў нашу рэспубліку 30 працэнтаў расійскай нафты па фіксаваных цэнах. У тэматыцы перагавораў — справы транспарту, граніц, аб'ектаў за рубяжом, вядома ж, Чарнобыль, узаемаадносіны ў ваеннай галіне.

Ацэньваючы вынікі сустрэчы, Ягор Гайдар сказаў журналістам:

— Закладзены вельмі добрыя асновы ўсталявання цесных адносін паміж дзвюма незалежнымі дзяржавамі.

Беларускі прэм'ер на пытанне карэспандэнта «Звязды» аб рангу маскоўскай сустрэчы ацаніў яе як першае на такім высокім і сур'ёзным узроўні спатканне ўрадаў дзвюх рэспублік пасля развалу СССР. На пытанне, што на сустрэчы было самым цяжкім і самым лёгкім, ён адказаў:

(Заканчэнне на 3-й стар.).

Яшчэ адно «Басовішча» стала набыткам гісторыі

БЕЛАСТОК. (І. Карней). Днямі пад Беластокам завяршыўся трэці музычны фестываль «Маладой Беларусі» «Басовішча-92», арганізаваны беларускім аб'яднаннем студэнтаў са штабкватэрай у Беластоку.

Удзел у конкурснай праграме прынялі як «монстры» беларускага року, так і навічкі, якія робяць на прафесіянальнай сцэне толькі першыя крокі. У прыватнасці, не маюць патрэбы ў рэкламе такія прызнаныя аўтарытэты, як «Уліс», «Мроя», «Мясцовы час». А вось з дэбютантаў сапраўдны фурор выклікала маладая англамоўная група з Гродна «Севеш Б», якой гледачы ў конкурсе «Папуляр» аддалі свае галасы адразу ж пасля «Уліса». Што датычыцца галоўнага прыза ад журы і тытула «прыма», то іх заваявала мінская каманда «Крама».

ВА ЎРАДЗЕ РЭСПУБЛІКІ

З 22 ліпеня г. г. Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Вячаслаў Кебіч знаходзіцца ў чарговым водпуску.

(БЕЛІНФАРМ).

ДА ЎРУЧЭННЯ ВЯРЫЦЕЛЬНЫХ ГРАМАТ

21 ліпеня Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Іспаніі ў Беларусі Эухеніо Брэгалат Абіелс уручыў вярыцельныя граматы Старшыні Вярхоўнага Савета рэспублікі Станіславу Шушкевічу.

Пан Брэгалат нарадзіўся 26 студзеня 1943 года. Дыпламатычную кар'еру пачаў у 1971 годзе, атрымаўшы ранг трэцяга сакратара. З верасня 1971 года працаваў у галоўным упраўленні па пытаннях Еўропы міністэрства замежных спраў Іспаніі, з сакавіка 1972 года — у гандлёвым прадстаўніцтве Іспаніі ў СССР. З 28 верасня 1972 года — начальнік аддзела Паўднёвай Еўропы галоўнага сектара па пытаннях Еўропы. З 1978 года — саветнік пасольства ў камісіі па абслугоўванню апарату старшыні ўрада. З 29 верасня таго ж года — дырэктар службы вывучэння кабінета старшыні ўрада. 26 лютага 1982 года быў назначаны паслом Іспаніі ў Рэспубліцы Інданезія. У 1986 годзе ўдастоены рангу паўнамоцнага міністра трэцяга класа, быў назначаны паслом у КНР, а затым паслом у Канадзе. Цяпер з'яўляецца паслом Іспаніі ў Маскве.

Пан Брэгалат узнагароджаны ордэнам «Ісабель ла каталіка», мае крыж Ордэна за ваенныя заслугі з белым знакам адрознення першага класа, з'яўляецца камандорам першай ступені караля Абдул Азіза, манарха Саудаўскай Аравіі.

Ліцэнзіят права.

Аддзел інфармацыі МЗС Рэспублікі Беларусь—БЕЛІНФАРМ.

НАПАЛОХАЛІ БУДАЎНІКОЎ. ЛЁГКА

ПІНСК. Адміністрацыйна-тэхнічная інспекцыя склала пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні БУ (будаўнічага ўпраўлення)-31, але палічыла неабходным штраф на вінаватых не накладваць і абмежавацца папярэджаннем. Прычына — неэфектыўнасць штрафных санкцый з-за смяхотнай сумы ў 250 рублёў.

З цеплатрасы па вуліцы Брэсцкай, якая рамонтуецца, БУ-31 вывозіла кавалкі цеплаізаляцыі і бетону і скідвала ў раёне моста праз раку Піна. Не так даўно ўпраўленне ўжо несла адказнасць за падобнае: туды ж, на правабярэжжа, ім вывозілася смецце. За такое ў Брэсце, напрыклад, упраўленне атрымала б штраф у 3.000 рублёў, у Баранавічах — 1.000. Сумы штрафаў у гэтых гарадах мясцовымі Саветамі ўстаноўлены ў абход закона, але дзейнічаюць больш эфектыўна: і казне прыносяць прыбытак, і прымушаюць парушальнікаў расплачвацца за ўчыненае. У Пінску ж, дзякуючы гуманнаму Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэннях, нядбайнае гаспадаранне абышлося лёгкім спалохам.

ПРА ЛЮДСКАСЦЬ

ПА РОЗНЫЯ БАКІ АД МАГІЛЫ

Курапаты. Месца масавых расстрэлаў. Месца нашага смутку і памяці.

Няпраўда, што кулі сталінскіх катаў застылі ў грудзях забітых тут людзей. Несучы атруту бяздушнасці, яны паранейшаму ляцяць, забіваючы сумленне, памяць, годнасць — усё, супраць чаго былі адліты ў арсеналах таталітарнай дзяржавы.

Нядаўна наша газета паведамляла пра вандалізм у Курапатах: знішчэнне памятнага знака, кастрышчы на могілках. Сёняшнія навіны яшчэ горшыя. Ва ўрочышчы раскопваюць захаванні ў пошуках каштоўнасцей. Але ёсць іншыя весткі. Аргкамітэт грамадска-хрысціянскага аб'яднання «Курапаты» разам з мясцовым лясніцтвам аднавіў парушанае. Прыбрана невялікая частка тэрыторыі. Вандаламі зацікавілася пракуратура.

Па розныя бакі ад магілы, на розных полюсах грамадства стаяць тыя, хто прыходзіць сюды. Адны ўпотай раскопваюць, кідаюць разам з зямлёй косткі, трушчаць рыдлёўкамі сківіцы чарапоў, шукаючы залатыя зубы.

Другія нясуць кветкі да крыжа з надпісам «пакутнікам Беларусі», даглядаюць месцы захаванняў — нібы спавядаюць чысціню і чалавечнасць. Нібы каюцца за ўсіх нас.

Міжволі прыходзіць думка, якая не ўзнікла б сама па сабе, без гэтых фактаў. Як прадказана спрадвеку, сваё слова абвінавачвання ў судзе над усімі жывымі, пэўна, скажуць і мёртвыя. Толькі які яшчэ прысуд чакае тых, хто зведаў усе вядомыя кары,— кроў рэвалюцый і войнаў, голад у краіне «ўсенароднага дабрабыту», атручэнне радыяцыяй.

Гэты прысуд страшней, бо спасцігне ён не цела, а душу. Няздольныя абараніць памяць мёртвых, мы ніколі не захаваем годнасць жывых.

Яўген ПЯСЕЦКІ.

ФАДЫЁ ФАКТ

Батоны для паскарэння вываду з арганізма радыенуклідаў пад назвай «Здароўе» пачалі выпускаць на Ваўкавыскім хлебазаводзе. Хлебныя вырабы утрымліваюць не толькі звычайныя кампаненты: муку, цукар, маргарын, соль, дрожджы, але і правітамін «А», так званы каракін у масле. Ён і садзейнічае выводу радыенуклідаў.

***

У апошні час у Беларусі пачасціліся выпадкі нападу на вартавых. Як паведаміў карэспандэнту РІА ў ваеннай пракуратуры, толькі за мінулы тыдзень падобнае здарылася двойчы. У Слуцку двое невядомых напалі на салдата, які ахоўваў ваенны склад, звязалі яго і забралі аўтамат і два магазіны з патронамі. У Гродне на свайго саслужыўца напалі двое былых салдат гэтай жа вайсковай часці. Яны таксама забралі зброю і патроны. Пры нападзе быў прыменены газавы балончык.

У абодвух выпадках узбуджаны крымінальныя справы.

***

Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія была ўдастоена гонару упершыню сфарміраваць групу студэнтаў для работы за мяжой. 38 чалавек былі накіраваны у Паўночную Чэха-Славакію. Пасялілі іх у выдатным атэлі «Старое піва», забяспечылі работай і кожны зарабіў за месяц каля чатырох з палавінай тысяч крон, што складае 20—25 тысяч рублёў.

Беларускім хлопцам гэтага здалося мала. На граніцы таможнікі ў братоў Л. выявілі 72 камплекты пасцельнай бялізны, уэтай з... атэля, і іншыя рэчы. Давялося братам аддаць у якасці штрафу увесь свой месячны заробак.

Але на гэтым прыгоды горацкіх студэнтаў не закончыліся. Па дарозе дамоў яны вырашылі заехаць у Варшаву на мясцовы рынак. Тут іх і сустрэлі рэкецёры. Вынік: студэнтам ледзьве хапіла сродкаў вярнуцца дадому.

***

Рубель стаў замежнай валютай яшчэ ў адной, пасля Эстоніі, Балтыйскай дзяржаве, — Латвіі. З памяжэлка на тэрыторыі рэспублікі адзіным афіцыйным плацёжным сродкам аб'яўлены латвійскі рубель — рубліс. «Уяндзен. не рубліса амаль не мяняе сістэму разлікаў паміж банкамі Расіі і Латвіі і не ўносіць у іх нівяк блытаніны», — заявіў карэспандэнту ІТАР—ТАСС саветнік старшыні цэнтральнага банка Расіі Міхаіл Іваноў.

***

Літоўскую эканоміку напаткала катастрофа, лічыць вядомы эканаміст прафесар Павілас Гіліс. У артыкуле, апублікаваным у газеце «Цієса», ён сцвярджае, што да ліквідацыі яе вынікаў спатрэбіцца пяць-сем гадоў, і ў гэтым выпадку вытворчасць толькі дасягне ўзроўню «канца савецкай эры».

Мінская навукова-вытворчая фірма «Талан», якую ўзначальвае Аляксандр Бараноўскі, не першы год займаецца дабрачыннай дзейнасцю: шэфствуе над інвалідамі Афганістана і Чарнобыля, над гематалагічным дзіцячым цэнтрам, што ў Бараўлянах, Вялікалетчанскай санаторнай школай-інтэрнатам, якія сістэматычна атрымліваюць матэрыяльную дапамогу.

У апошні час «таланаўцы» клапоцяцца аб аздараўленні дзяцей.

Нядаўна чарговая група мінскіх дзяцей вярнулася з Германіі, дзе правяла 21 дзень. Яшчэ адна — адправілася пад Познань.

— Канешне, мы маглі б аказваць яшчэ большую дапамогу, — расказвае Аляксандр Сцяпанавіч Бараноўскі, — але ж на кожным кроку — бар'еры. Скажам, за аўтобус аўтатранспартныя прадпрыемствы з нас патрабуюць 140 тысяч рублёў. Атрымліваецца не гуманітарны, а камерцыйны рэйс. Хаця мы аплачваем камандзіраванныя вадзіцелям, паліва, эксплуатацыйныя расходы. Жах! У нас на дзецях робяць бізнес!

На ЗДЫМКУ: сустрэча чарговай групы дзяцей з-за мяжы. На заднім плане — А. БАРАНОЎСКІ.

Фота Віктара ДРАЧОВА.

Уладзімір ЖАЛІБА:

«ХАЧУ БЫЦЬ ПАСЛОМ ДАБРА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Нярэдка можна чуць, што, маўляў, Украіна незгаворлівая і адыгрывае тут ледзь ці не разбуральную ролю. Усё гэта далёкае ад рэчаіснасці. Было б не толькі наіўна, але і небяспечна замкнуцца ў сваёй — няхай нават і камфартабельнай — нацыянальнай кватэры, парушыць стогадовыя чалавечыя сувязі. Адзінае, чаго дабіваецца Украіна, — выканання ў поўным аб'ёме як аднабаковых абавязацельстваў, так і шматбаковых дагаворанасцей. Мы, украінцы, не дапускаем дыктату іншых дзяржаў, бо ўпэўнены: гэта прамы шлях да рэстаўрацыі імперыі. Выбрацца з засмактаўшай нас усіх дрыгвы, як пастаянна падкрэслівае наш прэзідэнт, мы можам толькі агульнымі сіламі. І важна не падмануць чаканні народаў.

Што ж датычыць Балтыйска-Чарнаморскага саюза — я азнаёміўся з некаторымі публікацыямі на гэтую тэму. Ідэя вельмі цікавая, але — патрэбны час, каб мы маглі вызначыцца.

— У выпадку працягу спроб Масквы вырашыць праблему Крыма на сваю карысць — ці можа Украіна паставіць пытанне аб прыналежнасці Кубані і Слабажанскай (Слабодскай) Украіны, якія некалі былі заселены ўкраінцамі, а цяпер знаходзяцца ў саставе Расіі?

— Я думаю, гэтага не будзе. Мы павінны зыходзіць з існуючай рэальнасці...

— Прабачце, што перабіў, Уладзімір Іванавіч: зыходзіць з існуючай рэальнасці — якраз у гэтым і заключаецца галоўны прынцып дэмакратычнага і, шырэй, еўрапейскага складу думак. Процілеглае яму, імперска-азіяцкае мысленне пры вырашэнні любога пытання зыходзіць з вялікага, мінулага або не менш грандыёзнага будучага. Вы згодны?

— Так. І ўсякае «спаборніцтва» ў тэрытарыяльных прэтэнзіях — гэта безразважна. Ніводнае палітычнае пытанне не павінна вырашацца сілавымі прыёмамі. Асновай адносін паміж рэспублікамі павінны быць абмеркаванне, перагаворы, разважны сэнс.

— Ці лічыце вы магчымым пераўтварэнне Украіны ў федэратыўную рэспубліку, якая складаецца з аўтаномных зямель: Крыма, Галіцыі, Валыні і гэтак далей? Услед за Украінай гэта магло б адбыцца і з Беларуссю.

—Прынамсі, у бліжэйшым будучым, як мне думаецца, гэтага не здарыцца. На прэзідэнцкіх выбарах у праграмах некаторых кандыдатаў змяшчаліся пэўныя праекты, але ў народа падтрымкі яны не атрымалі. Восенню на ўсенароднае абмеркаванне будзе вынесены праект новай Канстытуцыі Украіны, так што гэта праблема яшчэ будзе абмяркоўвацца.

— Пан пасол, некаторыя палітычныя дзеячы на Украіне і на Беларускім Палессі ўзнімаюць пытанне аб «злучэнні Брэстчыны з Валынню». Ці існуе афіцыяльная пазіцыя Кіева наконт гэтай нагоды?

— Існуе. Яе неаднаразова выказваў прэзідэнт: Украіна ні да адной з суседніх краін не мае тэрытарыяльных прэтэнзій. Мы не павінны дапусціць ніякага нагнятання страсцей, неапраўданых эмоцый. А ўжо калі недзе і ўзнікне напружанасць — яе можна і трэба зняць у межах існуючых граніц, канешне — з улікам правоў і жаданняў людзей. Найлепшае выйсце з любой тэрытарыяльнай спрэчкі — стварэнне роўных умоў для прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей.

На Украіне жыве каля 300 тысяч беларусаў, і на Беларусі—больш як 400 тысяч украінцаў. Мы павінны зрабіць усё, каб гэтыя людзі не адчувалі сябе чужымі на сваёй новай радзіме. Сярод нашых беларусаў ёсць буйныя кіраўнікі, сапраўдныя патрыёты Украіны: Курашык, старшыня ўрада Крыма, або, напрыклад, Мельнікаў, прадстаўнік прэзідэнта ў Херсонскай вобласці.

— Украіна праіснавала ў саставе Расіі прыкладна на сто гадоў больш, чым Беларусь. На ваш погляд, чым можна растлумачыць, што русіфікацыя ў вашай рэспубліцы ўсё ж не зайшла так далёка, як на Беларусі? А наколькі паспяхова цяпер ідзе ўкраінізацыя?

— Пытанне далікатнае, тонкае, хваравітае. Натуральна, і адназначнага адказу на яго няма. Уся сутнасць, відаць, у гістарычных абставінах: у прыватнасці, Украіна даволі доўгі час мела некаторую аўтаномію ў саставе Расіі. Сёння ж галоўнае — не шукаць вінаватых, а выпраўляць становішча. Тактоўна, без кавалерыйскіх атак, але і без прамаруджвання. І абавязкова — у інтарэсах нацыянальнага адраджэння. Я вельмі люблю беларускую культуру. Гонар маю сказаць, што пры ўручэнні вярыцельных грамат сваю невялікую прамову сказаў на беларускай мове.

— Пан пасол, што вы хацелі б сказаць у заключэнне нашай гутаркі?

— Толькі супрацоўнічаючы паміж сабой, мы можам адрадзіцца самі. Новую Украіну будзе будаваць, перш за ўсё, украінскі народ. Адначасова Украіну будзе будаваць увесь свет — разуменнем яе, веданнем аб ёй, сваімі салідарнасцю, падтрымкай і любоўю. Дзякуй усім, хто жадае дабра Украіне. Запрашаем да супрацоўніцтва.

Гутарыў Юрый БАРЫСЕВІЧ.
БелаПАН.

«СЛАВЯНСКІ БАЗАР»

ФЕСТЫВАЛЬ У ЗЕНІЦЕ

Каторы дзень Віцебск жыве чароўнай атмасферай свята — песенны фестываль «Славянскі базар» у разгары. У горадзе чуваць беларуская, руская, украінская, англійская і польская гаворкі. Мінулая нядзеля прайшла пад знакам беларускай нацыянальнай культуры — фестываль адзначыў яе як Нацыянальны дзень Беларусі.

З самай раніцы ў культурных цэнтрах Віцебска адбываліся падзеі адна цікавейшая за другую: выстаўка народных рамёстваў, конкурс гарманістаў, свята для самых маленькіх гараджан, своеасаблівы міні-«славянскі базар» для дзятвы, карнавальныя шэсці і выступленні фальклорных калектываў Віцебшчыны, Украіны, Расіі.

У прызначаны час па асфальтаваных вуліцах Віцебска на ўдалым кані праехала заснавальніца горада над Дзвіною княгіня Вольга. З гэтага тэатралізаванага прадстаўлення і пачалося свята горада — старажытны Віцебск адзначыў сваё 1018-годдзе.

Увага мясцовых бізнесменаў была прыкавана да падзеі іншага плана: у Палацы культуры прафсаюзаў адкрылася прамысловая выстаўка «Благавіст-92». Сваю прадукцыю прадставілі амаль два дзесяткі прадпрыемстваў Ленінградскага раёна Кіева.

Фестывальны дзень Беларусі завяршыўся народнымі гуляннямі і запаленым на беразе Дзвіны «Кастром дружбы». Галоўная фестывальная пляцоўка — летні амфітэатр — вітала зорак беларускай эстрады. Грандыёзны гала-канцэрт закончыўся далёка за поўнач.

Удзельнікам «Славянскага базару» адрасаваў сваё прывітальнае слова ўрад Беларусі. У ім, у прыватнасці, адзначаецца, што суверэнная Беларусь запрасіла на сваю гасцінную зямлю славян свету, каб натхнёнай песняй сеяць зерне дружбы, дабра, спагады

Сёння «Славянскі базар» адзначае Нацыянальны дзень Расіі.

Для канкурсантаў жа пачаліся самыя цяжкія і хвалюючыя гадзіны: у спаборніцтва за Гран-пры — а гэта сто тысяч рублёў і, вядома, слава, папулярнасць — уступаюць дваццаць восем прэтэндэнтаў з Беларусі, Украіны, Расіі і Польшчы.

Сяргей НІКАНОРАЎ.
(БЕЛІНФАРМ).

Віцебск.

Не памятаю, хто сказаў, што ўсё наша жыццё — гэта тэатр, а людзі ў ім — акцёры. Дакладна ведаю адно. Ёсць рэчы, якія выходзяць далёка за рамкі нашай штодзённай, штомесячнай, штогадовай усеагульнай гульні. І тады ўжо не да аваўкай і не да аўтографаў і нават не да задавальнення сваіх карыслівых інтарэсаў і інтарэсаў блізкіх табе людзей.

Апошнім часам мне здаецца, што шчырымі мы можам быць толькі ў вялікай радасці ці вялікім горы. Шчырасць — не апошняя рэч на свеце. Нават калі эмоцыі цераз край. І калі асабістае крычыць мацней за ўсё.

Маці загінуўшых у Афганістане — здаецца, большыя ахвяры нядаўняй вайны, чым іх дзеці. У іх нічога не засталося больш важнага, чым памяць аб сваіх сынах. І яшчэ жаданне, шчырае жаданне дайсці да праўды аб афганскай вайне. Нягледзячы на ўласны боль і нейкі ўнутраны бар'ер далікатнасці тэмы.

У любым выпадку яны маюць права быць пачутымі ў першую чаргу, таму што яны — Маці і таму што яны з нас усіх, з гэтай зямлі, з гэтай жыццёвай праўды, якая яна ёсць.

Быць нейкім трацейскім суддзёю паміж імі і Святланай Алексіевіч, па-мойму, не патрэбная рэч. Іх рассудзіць само жыццё. Алексіевіч у апошніх сваіх газетных і часопісных выступленнях выказала сваю апошнюю пазіцыю. Маці ж загінуўшых у Афганістане прынеслі гэта адкрытае пісьмо ў рэдакцыю, і мы палічылі мэтазгодным яго надрукаваць.

Аляксандр КОКТЫШ.

«НЯЎЖО НАМ ТРЭБА ІГРАЦЬ МАЦІ-ЗАБОЙЦ?!»

Пані Алексіевіч!

Маці Беларусі звяртаюцца да Вас і заклікаюць Вас да разважлівасці, чысціні маралі і чалавечай адказнасці перад нашчуццё святое і глыбокае. Яна не кожнаму даступнае і зразумелае. Ні мы, ні нашы дзеці ніколі не здраджвалі свайму Сумленню. І мы, і яны ніколі б не паехалі ў чужую краіну з мэтай выліць бруд і зняваагу на народ Дзяржавы, у якой жывеш.

Калі Вы ўжо такі «аматар» праўды, як крычыце паўсюдна, дык чэсна раскажыце пра тое, як стваралі «шэдэўр» — сваю кніжку «Цынкавыя хлопчыкі», як «хітрай лісой» уваходзілі ў кватэры загінуўшых і, распытваючы Маці, зноў прымушалі пераказваць Вам шлях ад нараджэння дзіцяці да магільнага ўзгорку, як неслі ад нас пісьмы, дзённікі Сыноў і абяцалі напісаць праўду. Дазвольце спытаць, пані, для чаго Вы гэта рабілі. І чаму дагэтуль некаторым бацькам Вы не вярнулі пісьмы Сыноў? Мы прымалі Вас як родную, нікому і ў галаву не прыйшло, што такое кашчунства Вы можаце так спакойна і бессардэчна ўчыніць з намі. А зрабілі Вы гэта толькі дзеля таго, каб потым сказаць: «Я была ў іх», і з гэтай жа мэтай паехалі ў сваю 3-дзённую камандзіроўку ў Афганістан, каб заявіць потым: «Я там была». І нам даводзіцца шкадаваць, што там Вас ахоўвалі нашы Хлопчыкі, за вашу хлусню. Лёс павінен быў распарадзіцца інакш, трэба было б Вам трапіць у рукі душманаў, каб Вы адчулі сапраўдную іх «тэцінмасць». Гэта толькі потым, пасля першай публікацыі ў «Комсомолке» ўрыўкаў з прозвішчамі нашымі пад дыялогам мы зразумелі, што ў Вас ужо была напісана кніга пра негатывы нашага грамадства: п'яніц, наркаманаў, распуснікаў, зладзеяў, розных нягоднікаў. І Вы пад гэтым збродам апісанняў паставілі нашы імёны і імёны хлопчыкаў-інвалідаў і, не паведаміўшы нам, моўчкі апублікавалі. А калі мы патрабавалі тлумачэнняў, Вы ўсе прозвішчы знялі і надрукавалі асобна: разбяры, дзе чыё, але гэта ваша! Злодзеем прыйшлі Вы да нас, выкарысталі наш давер. Вось з таго часу Вы хаваецеся ад нас, як злачынца, а мы шукаем Вас, запрашаем для прамой размовы з вока на вока. Вось чаму паклёпніцка-апраўдальныя інтэрв'ю з Вамі з'яўляюцца ў друку. Вы і там такім жа чынам уваходзіце ў давер. Мы патрабуем ад Вас, пані Алексіевіч, прад'яўлення нашых подпісаў пад дыялогамі, што дазваляюць выданне кнігі! Дзе яны?

Праз некаторы час і пасля Вашай сустрэчы з хлопцамі ў «Кроку» ў сваім інтэрв'ю І. Гурыновіч у «Советской Белоруссии» Вы зноў хлусіце: «...Гутарка скончылася тым, што маці тут, гэта дзеці беларускага народа, і Вы свайго меркавання ім не навязвайце! Не супраць інтэрнацыяналістаў трэба весці барацьбу. Гэтае пяніцце было і будзе, пакуль жыве чалавецтва, а мы вялі і вядзём барацьбу з крамлёўскімі генсекамі, якія для апраўдання сваёй авантуры прыпісалі дзецям савецкага народа інтэрнацыянальны абавязак, а прэса і сродкі масавай інфармацыі разнеслі па СССР гэтае азначэнне для пакрыцця злачынства перад народамі, нацкаваўшы іх адзін на аднаго. Мы і цяпер дабіваемся прыняцця статуса ўдзельніка вайны. Так што Вы тут і зусім ні пры чым, не прыпісвайце сабе, чаго не трэба.

Вы, пані, гаворыце пра гібель мільёна карэнных «афганцаў». Паклаўшы руку на сэрца, прызнайцеся сумленна, што Вам гэта абыякава, таксама ж, як і гібель нашых дзяцей, а пішаце і гаворыце толькі па адной прычыне: зарабляеце на гэтай тэме багаццё. Чаму ж Вы, на прыкладу А. Салжаніцына, Д. Сахарава, не ўзнімалі пытання, калі ішла гэтая вайна? Яны ж не баяліся! Настойліва і смела выступалі не супраць Маці, а супраць тых, хто крываваў рукой учыняў забойствы. А Вы цяпер сябе параўналі з імі. Не Вы, пані, а Мы пасылалі тэлеграмы ў падтрымку Д. Сахарава, калі цкавалі яго на З'ездзе народных дэпутатаў СССР, і не Вы, а хлопцы-«афганцы» на руках неслі яго на могілкі і ўцерлі скупую мужчынскую слязу, не Вы, пані, а Мы — Маці Беларусі адвезлі зямлю беларускую і ружы да яго апошняга прытулку, з удзячнасцю і шанаваннем стаялі перад ім у нізкім паклоне. І не раім мы Вам, пані, параўноўваць нашых дзяцей ні з кім. Яны былі самі па сабе. У іх было і ёсць сваё жыццё, свой лёс, свой шлях.

Пані Алексіевіч! Маці, змучаныя горам, тугой аб Сыне, страціўшыя здароўе, увесь свой вольны час бавяць ля магіл сыноў, да бляску мыючы граніт, адчуваючы ў ім цяпло свайго дзіцяці, а Вы сцвярджаеце, што яны Вам пішуць зняважлівыя лісты. Чаму ж у сваім інтэрв'ю ці асобна, арыгіналам, Вы не выдадзіце іх? Гэта меркаванне Маці аб пісьменніку павінны ведаць усе, каб задумацца: чаму менавіта Вас зневажаюць яны! Выйшлі мы ўжо з таго ўзросту, каб пісаць некаму такое.

Карэспандэнту «Республики» Л. Свірыдаву мы ўдзячныя за дакладна сфармуляванае пытанне: «Святлана, як здарылася, што пасля «Цынкавых хлопчыкаў» у Вас узнік канфлікт з той часткай людзей, што былі вашымі аднадумцамі? Як тады, на прэзентацыі, Вы канкрэтна нічога не адказалі, так і тут... А ад гэтага ж пытання не ўхіліцца. Цяпер мы патрабуем сумленнага і прамога адказу на яго, а потым вырастуць дзеці тых, чые бацькі прайшлі дарогамі гэтай вайны, і таксама спытаюць у Вас, і так будзе да таго часу, пакуль Вы не адкажаце праўдай».

Пані Алексіевіч, хоць мы ўсе простыя беларускія жанчыны, аднак усе выдатна разумеем, што да чаго і чаму. Пасля «афганскай» вайны стаў магчымы Карабах, Грузія, Прыднястроўе, і што яшчэ чакае наперадзе, калі пасля Вашых публікацый учыняецца варварства над нашым Камнем, на нашым востраве — месцы будучага Помніка. Вы выхоўваеце зло і насілле, а гэта да дабра не давядзе. Вы зацвярджаеце сябе змагаром: за што і супраць кагоў? Але Вы не жадаеце чуць пра нашу барацьбу. Упершыню ў СССР голас Маці прагучаў з беларускай зямлі з патрабаваннем спыніць вайну ў Афганістане. Рэкі заяў, тэлеграм, зваротаў ішлі за ўсе інстанцыі Масквы, на ўсе форумы. Маці з Беларусі па тэлебачанні ў Парыжы заявіла, што ўсе кіраўнікі, што стаяць на чале СССР, у тым ліку і Гарбачоў, які кіраваў вайной у Афганістане больш за чатыры гады, павінны быць прыцягнуты да крымінальнай адказнасці за гібель народаў; гэта беларускую маці па Маскве шукалі карэспандэнты са Швейцарыі; уражаныя яе смелымі выказваннямі і справядлівымі патрабаваннямі на сустрэчы Маці з дэпутатамі Вярхоўнага Савета СССР, у тым ліку з Язавым і Катусевым. Гэта потым ужо, праз нейкі час, па нашаму пачыну пойдзе рух салдацкіх маці загінуўшых у мірны час, да якога іншы раз «прыліпалі» палітыкі, выкарыстоўваючы іх рух для сябе. У нашай барацьбе не было толькі падтрымкі прэсы і сродкаў масавай інфармацыі, якім мы заўсёды перасылаем свае патрабаванні, як і Вам. Але ўсе вы ўпарта маўчалі, чакалі і па-ранейшаму распаўсюджвалі чуткі аб «інтэрнацыянальным» абавязку нашых сыноў.

Прыйдзе час — і праўда пра гэтую вайну будзе сказана, і ўсе кропкі над «і» будуць расстаўлены, бо як-ніяк, а гэта наша гісторыя: добрая ці дрэнная — час пакажа. І хочам скончыць свой зварот да Вас, пані Алексіевіч, словамі Сына зямлі Беларусі, што вярнуўся ў цынкавай труне ў родную зямлю: «...Па «дарозе жыцця» Афганістана: Кабул — Саланг — Хайратон і далей цераз мост дружбы на Аму-Дар'і, да Тэрмеза, ідуць савецкія палкі, якія па дамоўленасці пакідаюць тэрыторыю ДРА. У газетах пішуць пра радасныя сустрэчы на роднай зямлі, пра натоўпы ўдзячных афганцаў, што праводзяць сваіх абаронцаў. Усё гэта так. Але як цяжка яны ідуць па гэтай зямлі, пад пастаяннымі абстрэламі душманскіх бандаў, праз агонь дэсантных баявых машын, праз свінцовы лівень, праз кроў і смерць.

І нехта застаўся навек, калі да дома заставаліся лічаныя сотні кіламетраў і дні. Круглыя суткі наша авіяцыя бамбіць зборышча ворага, але ўсё роўна ўдалечыні чутны разрывы і кулямётныя чэргі. На шляху нашых калон «духі» зусім азвярэлі, іх лозунг: «Ніводны савецкі салдат не павінен выйсці з Афганістана жывы.

Але калоны ідуць і вяртаюцца на Радзіму...»

18 кастрычніка 1986 года.

(З дзённіка Юрыя Галаўнёва).

А Вы, пані, за тры дні там «убачылі» ўсё іх жыццё?!

Маці ўдзячныя газетам «Звязда», «Советская Белоруссия», «Республика», што змаглі пазнаёміць нас з думкамі пані Алексіевіч. Цяпер мы цвёрда перакананы, што яна адна з тых, хто пасылаў туды нашых дзяцей, спрыяў замоўчванню сапраўдных фактаў падзей, чакаў, у які бок падзьме вецер, каб апраўдаць свой удзел у злачынстве і ўвесь бруд выліць на тых, хто зусім быў ні ў чым не вінаваты, хто верыў ім і таму разлічыўся крывёй.

Маці зямлі Беларусі:
І. С. Галаўнёва, Л. Е. Манкевіч, Н. С. Казлова, Н. В. Навічонак, Л. М. Штэпа, С. Г. Жураўлёва, М. Е. Бабун, П. В. Еўтуховіч, Л. П. Адамава, Г. Ф. Ільчанка, Е. Н. Плаціцына, Г. П. Трапашка, А. Г. Стукальская, О. Г. Даўкова, Л. А. Ладуцька, А. К. Ганчарык, Е. М. Волкава, М. А. Зільфігарава, Г. І. Даўгаполава, Г. Д. Асцякова, В. С. Бакшта, Н. А. Дусь, М. Т. Бабкова, А. М. Копа, В. М. Кароткая, М. П. Шэйка, В. Ф. Малышава, Г. К. Трацэўская, Е. І. Пунтус, Н. Н. Скакун, В. Х. Магілеўчык, П. А. Муравейка, Л. І. Аболін, В. А. Анісковіч, Г. А. Багамаз, В. Ф. Гурыновіч, абласныя камітэты Маці: г. Віцебска, г. Гродна, г. Брэста, г. Магілёва.

Быў час— і цэны зніжалі...

Дзесяцікразовым павышэннем цэн цяпер нікога не здзівіш. А 19-разовым пакіжэннем?

Нядаўна ў магазіне «Радыётэхніка» па вуліцы Апанскага бойка ішоў гандаль пласцінкамі «па цэнах ніжэй за рыначныя». Дакладней, уцэненымі. Прычым гаворка ідзе пра новыя дыскі вядомых груп і выканаўцаў. Прыводзім спіс гэтых пласцінак з указаннем новай і старой цаны.

«Рабочы раён», альбом «Рускі рок-н-рол» — 3 руб. (32.40), «ГПД», «Плата за ноч» — 1 руб. (7.20), «Нюанс», «Бяздомныя» — 3 рублі (34.80), Кацярына Сямёнава, «А жыццё мяне кружыла...» — 3 руб. (36.00), Ваня Маскоўскі, «Зроблена у СССР»—1 руб. (19.20).

Лідэрамі гэтага «хіт-парада», як мы бачым, сталі Ваня Маскоўскі і Каця Сямёнава, на іх музыку цэны зніжаны адпаведна ў 19 і 12 разоў!

Ігар МАЦВЕЕЎ, РІД.

І генералам вучыцца не позна

Пра гэта сведчаць тыя змены, што адбываюцца ў Мінскім вышэйшым ваенным інжынерным вучылішчы.

Памочнік начальніка МВВІВ па рабоце з асабовым саставам палкоўнік Павел Фамічоў расказаў:

— Паступова, на працягу 6—8 гадоў у вучылішчы будзе ўводзіцца беларуская мова. Працэс гэты складаны, патрабуе грунтоўнай падрыхтоўкі. Мы хочам, каб уваходжанне мовы ў жыццё было карэктным, не абражала нацыянальных пачуццяў афіцэраў, прапаршчыкаў, курсантаў—выхадцаў з іншых рэгіёнаў былога Саюза.

У нас плённа працуе гурток беларускай мовы, які наведваюць начальнік вучылішча генерал-маёр Віктар Осіпаў, усе яго намеснікі і начальнікі факультэтаў. Дарэчы, нядаўна яны паспяхова здалі экзамены па мове членам камісіі па культуры ВС.

Да такога экзамена рыхтуецца намеснік міністра абароны РБ генерал-маёр Віктар Ісайчанкаў. Вывучэнне беларускай мовы ён пачынаў у вучылішчы практычна з нуля.

Ганна САХОНЧЫК,
старшы лабарант МВВІВ.

МАШЫНУ НА КАНЯ

МЯНЯЮЦЬ ЛІТОЎЦЫ Ў БЕЛАРУСКІХ ВЁСКАХ. ЯНЫ ВЫЙГРАЮЦЬ, МЫ—НЕ

Здаўна конь быў верным памочнікам хлебароба. Аднак у век бурнага развіцця навукова-тэхнічнага прагрэсу ўвага да конегадоўлі аслабла і даводзіцца толькі шкадаваць, што пазіцыі здалі нават тыя раёны Гродзеншчыны, якія яшчэ параўнаўча нядаўна былі цэнтрам развядзення беларускага каня — адной з найбольш каштоўных нават сярод заводскіх парод. Перш за ўсё гэта датычыцца Ашмянскага раёна, гаспадаркі якога раней штогод рэалізоўвалі не менш за 55—60 племянных коней.

Племянное гняздо было, напрыклад, у саўгасе «Гальшаны». Конюх Эдуард Антонавіч Сарока — неаднаразовы ўдзельнік ВДНГ СССР — дэманстраваў там свайго Орліка, узнагароджанага трыма дыпломамі першай ступені. Праца конюха адзначалася медалямі выставачнага камітэта, дыпломамі, граматамі і грашовымі прэміямі. Дырэктар саўгаса за падрыхтоўку да ўсесаюзных спаборніцтваў двойчы ўзнагароджаны ўсесаюзнымі граматамі.

Не менш каштоўныя племянныя гнёзды і фермы былі ў калгасах імя Карла Маркса, «Кемелішкі» Астравецкага раёна. На жаль, за апошнія гады яны таксама прыйшлі ў заняпад.

Тэндэнцыя да скарачэння колькасці коней у гаспадарках выяўлена вельмі выразна. Так, яшчэ 5—6 гадоў назад іх было ў Астравецкім раёне каля 1.700 галоў, а ў 1990 годзе — 1.419. За мінулы год колькасць коней скарацілася яшчэ на 138. У параўнанні з папярэднім годам павялічылася гібель коней.

Практыка выкарыстання коней у саўгасе «Гальшаны» Ашмянскага і калгасе «Радзіма» Астравецкага раёнаў пераконвае: нават пры высокім узроўні механізацыі на конях эканамічна выгадна выконваць да 15 працэнтаў лёгкіх палявых, а таксама транспартных работ на адлегласці да 5 кіламетраў. Кожны рабочы конь у гэтых і іншых гаспадарках эканоміць у год да адной тоны гаручазмазачных матэрыялаў і значныя грашовыя сумы.

Каму не вядомы пакуты сельскага жыхара з апрацоўкай прысядзібнага ўчастка, агарода. І калі на асноўныя соткі ў поле калгас усё ж прысылае тэхніку, дык з агародам пры доме — проста бяда. Вялікая машына тут не пойдзе, а да адзінай пары коней на ўсю вёску — не падступіцца. Асабліва тым, хто ўжо на пенсіі і ў справах гаспадаркі не ўдзельнічае. Старыя людзі вымушаны ледзь ці не на калені станавіцца перад тымі, у каго ў руках конь ці які-небудзь механізм. У ход ідзе магарыч, льюцца слёзы. Але нярэдка нішто не дапамагае — коней толькі два, тады застаецца адзін паратунак — рыдлёўка ды матыка.

Апошнім часам у раён зачасцілі літоўцы з адной мэтай: замяняць асабістыя «Жыгулі» на каня і нават без даплат за аўтамабіль. Ды і ў раёне цяпер сёй-той заяўляе: я б у фермеры пайшоў ці зямлю ў арэнду ўзяў, але з чаго пачынаць? Хоць бы для пачатку конь быў! А коней няма ні за якія грошы. Ну, а што ўзамен каня? Шматсільныя, дарагія трактары!

Невялікі, зручны ва ўсіх адносінах патрэбен трактар для будучых фермераў. Але няма пакуль што нічога. Сельскім працаўнікам настаў час спытаць у сваіх кіраўнікоў: чаму, уласна, яны адмаўляюцца ад жывёл, якія стагоддзямі верай і праўдай служылі земляробу? Аднак галіна літаральна асуджана на дэградацыю. Намнога лепшым павінна быць лячэнне коней, а таксама санітарны стан канюшань, іншых памяшканняў, дзе яны трымаюцца. А гэта магчыма толькі пры наяўнасці абучаных кадраў — добрых конюхаў. У нас жа зусім адсутнічае клопат аб росце маладых кадраў-каняводаў.

Гэтыя і іншыя недахопы, а таксама абыякавыя адносіны да вырашэння праблемы з боку кіраўнікоў і спецыялістаў гаспадарак і прывялі да таго, што конегадоўля апынулася ў заняпадзе, і калі яшчэ трымаецца сяк-так, дык дзякуючы руплівасці, любові да сваёй працы конюхаў-аматараў.

Да ўсяго сказанага хацелася б дадаць, што разам з племянным развядзеннем коней вялікія перспектывы мае і прадукцыйная мясная і малочная конегадоўля, якая ў нас знаходзіцца ў пачатковым стане. Між тым пастаўкі коней дзяржаве ідуць у залік планаў па продажу мяса, а іх экспарт з'яўляецца стабільнай крыніцай папаўнення казны валютай. Заслугоўвае ўвагі і развіццё вытворчасці кумысу — напітку волатаў. Яго выраб можна было б арганізаваць у любой гаспадарцы. Пры стойлава-пашавым утрыманні кабылы даюць ад 1.320 да 2.550 літраў малака за паўгадавую лактацыю! Вось дзе прастора для дзейнасці кааператараў.

Трэба не толькі гаварыць на поўны голас, але і патрабаваць вяртання каня, як даступнай і таннай цяглавай сілы для нашага селяніна. Асабліва цяпер, калі пачынаюць развівацца фермерскія гаспадаркі, іншыя вытворчыя адносіны ў вёсцы.

І. КАВАЛЬЧУК,
ветурач.

ВОЗГАДАЕ РОЗГАДАЕ

ГАРАЦЬ ГАРАЖЫ

Магутны выбух страсянуў прыватныя аўтамабільныя гаражы на ўскраіне Магілёва. Пяць з іх разбураны, згарэў аўтамабіль «Жыгулі». Віноўнікам выбуху аказаўся кранаўшчык Магілёўскага УМ-106 В. Абакановіч. Вельмі ж ужо грунтоўна запасся ён гаруча-змазачнымі матэрыяламі.

Аднаго бензіну была двухсотлітровая бочка і малочны бітон, не гаворачы аб вёдрах машыннага масла, тасолу і г. д.

...У той вечар Абакановічы прыйшлі ў склад-гараж усёй сям'ёй. У цемры чыркнула запалка, «каб пасвяціць». Скопленыя гаручыя пары рванулі так, што сам запаслівы гаспадар, яго жонка і дачка аказаліся ў бальніцы з вельмі цяжкімі апёкамі.

— Апошнім часам у вобласці згарэла ўжо каля дзесятка гаражоў, — пракамеціраваў трывожны факт начальнік упраўлення пажарнай аховы УУС Магілёўскага аблвыканкома Іван Клімчынскі. — Прычыны тыя ж, што і ў апошнім выпадку ў Магілёве. Уладальнікі асабістых аўтамашын усімі праўдамі і няпраўдамі здабываюць гаручае і захоўваюць яго насуперак элементарным правілам процiпажарнай бяспекі разам з аўтамабілямі. Штурхае на гэта ажыятажны дэфіцыт на паліва. Узяць хоць бы апошняе ўвядзенне картачнай сістэмы. Месячны тэрмін дзеяння картак прымушае вадзіцеляў выбіраць свой ліміт — інакш прападзе. Але ж можна было б павялічыць гэтыя тэрміны хоць бы на два месяцы наперад і на два назад. Тады аўтамабілісты былі б упэўнены ў заўтрашнім дні і не стваралі пажаранебяспечную сітуацыю для цэлых гарадскіх раёнаў. Але ў мясцовых Саветах аб гэтым пакуль што не думаюць.

М. НАЗАРОВІЧ, (БЕЛІНФАРМ).

САЮЗ РУЖЖА І ВУДАЧКІ

МІНСК. Сёння ў сталіцы Беларусі пачынаецца з'езд арганізацый, члены якой непасрэдна звязаны з беларускімі зайчыкамі і вавёркамі.

Аднак гэта зусім не банкіры ці прадстаўнікі іншых фінансавых структур. Проста 22 ліпеня адкрываецца сёмы з'езд Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў. БТПР было створана ў 1921 годзе, у 1937-м закрыта і зноў адноўлена толькі ў 1955 годзе. У карыстанне таварыства перададзена 80 працэнтаў (14,2 мільёна гектараў) усіх паляўнічых угоддзяў рэспублікі, 92,5 тысячы гектараў вадасховішчаў і 4,1 тысячы кіламетраў рэк. У сваіх радах БТПР аб'ядноўвае 168,8 тысячы членаў, а гэта кожны шасцідзесяты жыхар Рэспублікі Беларусь (апошняя лічба дадзена без уліку шматлікіх браканьераў, якія паспяхова абыходзяцца без членства ў таварыстве).

Трэба сказаць, што БТПР — адна з тых нешматлікіх арганізацый, якая працуе не для «птушкі» ў адпаведнай графе. У 1987-91 гадах на ажыццяўленне гаспадарчай дзейнасці паляўніча-рыбалоўных гаспадарак было накіравана 13,2 мільёна рублёў, акрамя таго, членамі таварыства добраахвотна выканана работ на 12 мільёнаў рублёў.

У адрозненне ад сваіх супляменнікаў на грашовых купюрах, жыццё сапраўдных жывёлін не надта салодкае. У 1991 годзе паляўнічымі БТПР было здабыта 2.862 ласі, 4.436 дзікоў, 659 ваўкоў, 1.200 баброў, 66.570 зайцоў, 303.800 качак, хаця ў цэлым папуляцыі жывёл і птушак падтрымліваюцца на патрэбным узроўні. Колькасць паляўнічых сабак з 1987 года ўзрасла амаль удвая і зараз складае 11 сабак на 100 паляўнічых, што адпавядае аналагічнаму паказчыку краін з высокім узроўнем вядзення паляўнічых гаспадарак.

У БТПР сёння цяжкае становішча. Нягледзячы на нядрэнны фінансавы стан, таварыства раздзіраюць знешнія і ўнутраныя канфлікты. Некаторыя ўвогуле лічаць, што такая арганізацыя не патрэбна. Дзейнічаючы ў напрамку барацьбы з бюракратыяй, БТПР скараціла свой адміністрацыйна-кіраўніцкі апарат з 246 чалавек (у 1987 годзе) да 217 (зараз).

Трэба сказаць, што таварыства паляўнічых і рыбаловаў ідзе ў авангардзе экалагічнага руху, а гэта значыць, што яно мае права на жыццё.

БАГАТЫЯ ПЛАЧУЦЬ Ў ДЗВЕ ЗМЕНЫ

Аказваецца, з набыццём спадарожнікавай антэны, відэамагнітафона і відэакамеры значна знізілася колькасць прагулаў на Шацкім механічным заводзе. Раней адміністрацыя прадпрыемства пачынала плакаць разам з «Багатымі...», таму што ў час дэманстрацыі серыяла колькасць працуючых на заводзе змяншалася амаль на трэць. Цяпер жа з дапамогай заводскага тэлецэнтра можна рабіць паўторы любімых фільмаў, а значыць, абедзве заводскія змены маюць магчымасць атрымаць сваю долю «кінанаркотыку». У кватэрах завадчан праз спадарожнікавую антэну прымаюць таксама яшчэ тры праграмы з-за мяжы, прычым за чыста сімвалічную плату.

РІД.

ЯК ЖЫЦЬ ПАСЛЯ «РАЗВОДУ»?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

— Мы не можам раздзяляць нашы размовы на самыя цяжкія і самыя лёгкія. Гэта проста дзелавая работа. Мы працавалі, не аглядваючыся, дзе цяжка, а дзе лёгка.

Адно перакананне засталося ў мяне пасля сустрэч у гасцініцы «Прэзідэнт» — што ні кажы, але тыя цесныя сувязі, якія дзесяцігоддзямі складваліся паміж дзвюма рэспублікамі былога СССР, будуць, нягледзячы на ўсе складанасці, развівацца і далей. Іншая справа, што гэта сумеснае жыццё набывае зусім іншы характар, калі паняцці «старэйшы брат» і «малодшы брат» становяцца анахранізмам. Толькі цывілізаваныя, узаемавыгадныя адносіны паміж дзвюма незалежнымі краінамі павінны цяпер наладжвацца па ўсіх напрамках. Будзем спадзявацца на гэта.

Міхаіл БАЦЯН, уласны кар. «Звязды».
г. Масква.

ПРАЗ СУПРАЦОЎНІЦТВА— ДА САПРАЎДНАЙ ДРУЖБЫ

Як мы паведамлялі ўжо, 20 ліпеня ў Маскве адбылася сустрэча ўрадавых дэлегацый Расіі і Беларусі. Яна завяршылася падпісаннем рада дакументаў. Але з-за таго, што сваю работу дэлегацыі закончылі позна, БЕЛІНФАРМ змог расказаць толькі аб пачатку сустрэчы. Цяпер прапануем матэрыял аб яе завяршэнні.

Каля трыццаці дакументаў падпісана на праходзіўшай 20 ліпеня ў Маскве сустрэчы ўрадавых дэлегацый Расіі і Беларусі на чале з Ягорам Гайдарам і Вячаславам Кебічам. З гэтага аб'ёмістага пакета каля паўтара дзесяткаў дакументаў, якія датычаць ваенна-палітычных і эканамічных праблем, было падпісана прэм'ерамі дзвюх краін. Прыкладна столькі ж пагадненняў і пратаколаў падпісана на ўзроўні намеснікаў старшыні ўрада, міністраў. Сярод важнейшых з іх — пагадненне аб умовах паставак прадукцыі, тавараў, сыравіны, прадуктаў харчавання паміж прадпрыемствамі і арганізацыямі Расіі і Беларусі, пагадненне аб цэнаўтварэнні на прадукцыю міждзяржаўнага абмену, пагадненне аб падатковай палітыцы, дагавор аб супрацоўніцтве ў ваеннай галіне.

Адказваючы на пытанні журналістаў пасля цырымоніі падпісання, в. а. прэм'ер-міністра Расіі Ягор Гайдар заявіў, што «сёння мы сфарміравалі базу для цесных, вельмі цесных адносін Расіі з Беларуссю».

Ён паведаміў, што падпісаны 21 дакумент. «Мы заклалі сёння вельмі добрую аснову станаўлення самых цесных эканамічных, палітычных, абаронных, культурных сувязей паміж нашымі незалежнымі дзяржавамі... Я не сумняваюся, што гэтыя пагадненні будуць «працаваць», паколькі прадугледжваюць высокі ўзровень рэальнай інтэграцыі нашых краін і ў пэўным сэнсе аднаўляюць тую адзіную сацыяльна-палітычную прастору, у якой жылі нашы народы»,— падкрэсліваў в. а. расійскага прэм'ер-міністра.

Ягор Гайдар сказаў, што многія з падпісаных дакументаў па сваёму эместу «выходзяць далёка за межы дагаворанасцей у рамках СНД». Сярод іх ён назваў пагадненне аб каардынацыі абаронай дзейнасці, аб размяшчэнні стратэгічных сіл Расіі на тэрыторыі Беларусі, пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне транспарту, у тым ліку транспарціроўкі нафты і газу.

Адказваючы на пытанне, ці можна лічыць дасягнутыя дагаворанасці «пачаткам канфедэрацыі» ў рамках СНД, Ягор Гайдар сказаў што іх можна разглядаць «крокам у гэтым напрамку». З такой трактоўкай пагадзіўся і кіраўнік беларускага ўрада Вячаслаў Кебіч.

Ці далучыцца Украіна да дасягнутых двухбаковых дагаворанасцей? Вячаслаў Кебіч заявіў, што «не займаецца прагнозамі», «гэта справа Украіны».

Ягор Гайдар у гэтай сувязі сказаў, што «з часткай краін СНД, якія будуць зацікаўлены ў такім жа цесным і эфектыўным механізме ўзаемадзеяння, уключаючы і цеснае супрацоўніцтва ў абаронай галіне», магчымэ заключэнне падобнага маштабнага пакета дакументаў.

Іван ІВАНОЎ, кар. ІТАР—ТАСС (спецыяльна для БЕЛІНФАРМ).

«ХУТЧЭЙ? ВЫШЭЙ? МАЦНЕЙ?..» ТАННЕЙ!,

АБО АБ ТРАНСФАРМАЦЫІ АЛІМПІЙСКАГА ЛОЗУНГА НА БЕЛАРУСІ

У Барселоне пачынаюцца Алімпійскія гульні, ад якіх хвалямі па ўсім свеце разносяцца заклікі: «Хутчэй! Вышэй! Мацней!» і чарговы ўдарлявы «інтэлігенцік» у Мінску ці іншым горадзе Беларусі, прачнуўшыся і паглядзеўшы ў люстэрка на свае «камарыныя» мышцы, разумее: «Так жыць нельга!». Парваўшы сваё пасведчанне аб першым разрадзе па шашках, ён пачынае выбіраць від спорту, ад якога ў як мага хутчэйшыя тэрміны пачнуць расці біцэпсы і ўсе знаёмыя дзяўчаты будуць з'язджаць з глузду. «Каратэ! Вось мая мара»,— думае наш герой, ускідаючы нагу да ўзроўню калена. Аднак які ж Брус Лі без добрага кімано? З марамі аб чорным поясе наш «спартсмен» прыходзіць у магазін і бачыць: простае кімано каштуе 750 рублёў, што раўняецца больш чым трэцяй частцы зарплаты, а гэта значыць — адсякаюцца ўсе думкі аб каратэ. Дарэчы, і аб іншых адзінаборствах таксама, бо пальчаткі для іх каштуюць 840 «драўляных», ды яшчэ абутак нейкі патрэбны, ды накладкі для галёнкі за 200 рублёў. Такі ж бясслаўны лёс напаткае і баксёрскую кар'еру нашага героя, якому пасля адпаведных пальчатак за 1.800 рублёў і адпаведнай «грушы» за дзве з паловай «капусты» захочацца пусціць кроў з носу хіба толькі дырэктару мясцовага спарткультгандлю за такія шалёныя цэны.

А можа, лепш пайсці па слядах Арнольда Шварцэнегера, «накачацца» да ачмурэння, напіцца малочных сумясей і хадзіць па вуліцах, металістаў ганяць? Ідэя нядрэнная, аднак самы танны атлетычны камплект «цягне» на 3.180 рублёў, а калі «ўзбуйняць» сваё цела ў хатніх умовах, дык кожны кіраграм «жалеза» адыме па 3 рублі 30 капеек. Адсюль лёгка падлічыць, што пудовая гіра абыдзецца наваяўленаму «качку» амаль у 50 рублёў, якая разам з эспандэрамі ад шасці да 94 рублёў дае зразумець цмянасць перспектывы жыцця «з вялікімі мускуламі». Аднак ўдарлявы «інтэлігенцік» не здаецца. Ён адмаўляецца ад сілы на карысць спрытнасці. Хутчэй на тэнісны корт! 70 «зайчыкаў» ракетка, 200 «завёрачак» сетка, адзін «воўк» — мяч і г. д. Не, тады хаця б за тэнісны стол! Набор для гульні ў тэніс — ад 205 да 330, ракетка (асобна) — ад 123 да 450 рублёў, ды яшчэ сам стол Бог ведае колькі. Усе названыя лічбы наогул адбіваюць у нашага героя ахвоту да заняткаў спортам, і ён застаецца дома, дзе разбірае шахматны эцюд і глядзіць па тэлевізары на новыя сусветныя рэкорды па цяжкай атлетыцы на Алімпіядзе ў Барселоне.

А цяпер уявіце, што на месцы ўдарлявага «інтэлігенціка» жанчына ўжо не «бальзакаўскага» ўзросту і далёка апярэдзіўшая вагу рафаэлеўскіх «мадонн», якой урачы прапанавалі тэрмінова займацца рухальнымі відамі спорту. Калі параметры цела дазваляюць уціснуцца ў абруч, то спатрэбіцца паменшыць бюджэт на 31 рубель. Калі не, то раніцу прыйдзецца пачынаць з гімнастычнай палкі (ад 13 да 22), дыска «Здароўе» — 114, са скакалкі — ад 10 рублёў і вышэй, або з невялічкай прабежкі з сяброўкамі (эстафетная палачка — 4 рублі). Карысна дзейнічаюць на змяншэнне вагі розныя гульні, такія, як валейбол (мяч — ад 230 да 310 «драўляных» ды сетка — 230), баскетбол (мяч — 84 плюс сетка — 8), воднае поло (мяч — 67, шапачка для плавання — 89 і купальнік — мінімум за 400). Тлустым мужчынам нядрэнна было б пагуляць у футбол (мяч — ад 290 да 450 неканверсуемых грашовых адзінак), пагуляць у більярд (шары коштам 125 рублёў за штуку), або пагойдацца на гімнастычных кольцах усяго за 114 «зрэзацгрошай». Аднак, паколькі «нестандартным» жанчынам і мужчынам усе гэтыя «забавы» будуць наўрад ці па кішэні, галоўным комплексам у іх жыцці назаўсёды так і застанецца ўласная вага.

А цяпер зробім выгляд, што ў ролі галоўнага героя выступае «накачаны» з галавы да ног супермен, які аднойчы зразумее, што вядомы выраз «сіла ёсць — розуму не трэба» адносіцца менавіта да яго. Для праветрывання мазгоў ён выфрашае навучыцца гуляць у шахматы (ад 50 рублёў да «кавалка»), шашкі (ад 42 да 200 «драўляных») ці якую іншую інтэлектуальную гульню, аднак цэннікі наводзяць «качка» на вельмі справядлівую думку аб тым, што «сіла ёсць і грошы трэба», таму ён хутка забывае аб сваёй мазгавой патрэбе.

Вось так сумна на фоне магчымых рэкордаў алімпійцаў у Барселоне заканчваецца наша кароткая гісторыя. Усе яе ўдзельнікі так і не змаглі далучыцца не толькі да «вялікага» спорту, а нават і да фізкультуры (дарэчы, мы наўмысна не палохалі чытачоў коштам простых кедаў і спартыўнага касцюма, які значна вышэйшы за пражытачны мінімум). Прычына вельмі празаічная — умацаванне здароўя праз фізічныя нагрузкі дрэнна адбіваецца на стане ўласнага кашалька. Можна, канешне, пачаць эканоміць, але тады ў нашага насельніцтва застануцца толькі два выхады. Альбо купіць гранату (спартыўную) за тры рублі і закінуць яе туды, адкуль дыктуюцца цэны. Альбо набыць за чатыры рублі ганаровы спартыўны кубак і ўручыць яго самому сабе за выдатныя дасягненні ў галіне фізкультуры і спорту. А лозунг «Хутчэй! Вышэй! Мацней!» пакінуць на раздзіранне алімпійцам і заможным людзям.

Станіслаў СУЛКОЎСКІ.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

ДА СНД ЯШЧЭ ПРОСТА НЕ ПАДРЫХТАВАЛІСЯ

Урад Літоўскай Рэспублікі прыняў пастанову аб парадку перасячэння дзяржаўнай граніцы Літвы. Права бязвізавага ўезду прадастаўляецца грамадзянам-суседзям з Латвіі і Эстоніі, а таксама Ісландыі і Вялікабрытаніі. Да асобага рашэння без віз эмогуць уязджаць у Літву таксама грамадзяне Польшчы, Чэхіі і Славакіі, Балгарыі і Венгрыі, бо гэтыя краіны не патрабуюць уязных віз ад грамадзян Літвы. У пастанове нічога не сказана аб грамадзянах краін СНД. Але з іх пакуль што пры перасячэнні літоўскай граніцы віз не патрабуюць, таму што тэхнічна адпаведныя службы да гэтага не гатовы.

АРЫФМЕТЫЧНАЯ ПРАГРЭСІЯ ПА БЕСПРАЦОЎЮ

Згодна з ацэнкамі Міністэрства сацыяльнай абароны Латвіі, да канца гэтага года 9—11 працэнтаў працаздольнага насельніцтва краіны могуць стаць беспрацоўнымі. Да канца 1993 года беспрацоўе можа дасягнуць 20 працэнтаў. Зараз у Латвіі зарэгістравана 8.700 беспрацоўных.

СТРЫПТЫЗ? АЛЕ НЕ Ў НАС

15 даўчат ва ўзросце ад 18 да 26 гадоў праходзяць абучэнне ў першай у Расіі школе стрыптызу, якую заснавала былая цыркачка Вера Лаўроўская і не муж — былы ўрач-гінеколаг Яўген Лаўроўскі.

Курсы (іх працягласць чатыры месяцы) каштуюць дзве тысячы рублёў. Цяперашнія «слухачкі» былі адабраны з 200 кандыдатак, якія прыехалі з розных месц былога Саюза. Пасля заканчэння курсаў дзяўчаты змогуць выконваць стрыптыз па кантракту (напэўна, за мяжой), колькі ім будуць плаціць — яшчэ невядома. В. Лаўроўская паведаміла, што ёю ўжо ўстаноўлены належныя кантракты з Ізраілем, Англіяй, Бельгіяй і Галандыяй.

«СПРАВА НЕ НА МЕСЯЦ, І НЕ НА ДВА»

Ужо двойчы газета давала інфармацыю аб тым, як ідзе справа па затрыманню «мінскага» маньяка (ці некалькіх забойцаў) двух малалетніх дзяцей. Ці зрушылася што з месца?

— Пакуль што канкрэтна падазраваемых няма,— кажа начальнік следчага аддзела пракуратуры горада Уладзімір Колатаў.— Можна сказаць, усё засталося без асаблівых перамен. Хоць і працуюць над гэтым лепшыя работнікі пракуратуры і міліцыі не менш напружана, чым раней. Будзем спадзявацца,— заключае Уладзімір Віктаравіч,— што злачынца адкажа перад законам.

КАБУРА ДЛЯ ПІСТАЛЕТА: РЭЧ НЕАБХОДНАЯ, ЦАНА НЕВЫСОКАЯ

● Днямі ў адным з камерцыйных кіёскаў, якія ў апошні час літаральна растуць, як грыбы, у самых розных месцах, я натрапіў на даволі цікавую рэч, прапакаваную ў свабодны продаж. Размова ідзе аб нагруднай кабуры для пісталета. Так, самай сапраўднай скуранай кабуры. Пакуль палітыкі вядуць дэбаты «за» і «супраць» свабоднага продажу зброі, мы паўсталі перад рэальнасцю: народ пачаў узбройвацца. Шалёны рост злачыннасці, няпэўненасць у заўтрашнім дні і, нарэшце, сітуацыя, якая складваецца ў былых брацкіх рэспубліках, ужо цяпер вымушаюць многіх думаць аб рэальнай абароне свайго гонару і правоў. І чым хутчэй парламентам і ўрадам будзе знойдзены які-небудзь дзейсны выхад з сённяшняй сітуацыі з гандлем зброяй (і не толькі газавай), тым хутчэй з'явіцца магчымасць узяць гэты працэс пад кантроль.

Віталій ЧУЯСАЎ.

НАВУЧАЦЬ ПОЛЬСКІЯ ФЕРМЕРЫ

● **Старшыня Беларускай сялянскай партыі Яўген Лугін правёў перагаворы з прадстаўніком Польскай сялянскай партыі Тэафілам Станіслаўскім.** Гаворка ішла аб умовах стажыроўкі беларускіх фермераў у Польшчы. Адзінае спрэчнае пытанне — аб суме кішэнных расходаў для стажораў. Кіраўніцтва БСП настойвае на 100 доларах для кожнага з фермераў. Акрамя таго, польскі бок, згодна з дасягнутымі раней дагаворанасцямі, абавязаўся забяспечыць нашых фермераў жыллём і харчаваннем на ўвесь час стажыроўкі. Дарэчы, для яе ўжо адабраны 150 чалавек.

КАМСАМОЛ НЕ РАСТАНЕЦЦА СА МНОЮ?

● **У Магілёўскім педінстытуце выдача дыпломаў студэнтам-выпускнікам пастаўлена ў залежнасць ад узаемаадносін апошніх з камсамолам.**

Справа ў тым, што ў абхадным лісце патрабуецца адзнака і камітэта камсамола, або, як ён цяпер называецца, Саюза моладзі Беларусі. А там будучым педагогам паведамілі, што гэты дакумент не будзе падпісаны да таго часу, пакуль яны не заплацяць членскія ўзносы на ўвесь год. Праўда, сума невялікая — усяго 60 рублёў.

Барыс МІХЕЕЎ.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ●

«НЯМЕЦКАЯ ХВАЛЯ»

* У Барнауле адбыўся мітынг камуністаў, на які сабралася каля 1.000 чалавек. Яны патрабавалі адстаўкі Б. Ельцына. А ў Кемерава прайшоў аб'яднаны пленум гаркома і абкома РКП, які пастанавіў падтрымліваць забастовачны рух працоўных і стварыць паралельныя структуры ўлады ў выглядзе саветаў рабочых, сялян, служачых. У Кузбасе зараз ад 4 да 10 тысяч членаў РКП.

* **У жыхароў былой ГДР жывучая настальгія па ранейшаму жыццю. Яна там прымае розныя формы. Ва Усходнім Берліне абвешчаны так званы «Камітэт справядлівасці», які лічыць сябе абаронцам правоў былых грамадзян ГДР. Сярод заснавальнікаў камітэта шмат інтэлектуалаў, якія нарысталіся значнымі прывілеямі пры ружыме Хонекера. Яны зараз не могуць знайсці сабе месца і адчуваюць сябе грамадзянамі другога гатунку. Нагледзьнікі лічаць, што раскол немцаў будзе паглыблядца ў выніку дзейнасці камітэта.**

РАДЫЁ «СВАБОДА»

* Больш за 40 чалавек загінулі ў выніку аварыі самалёта непадалёк ад Тбілісі. Прыбліжана 30 з іх — мясцовыя жыхары. Паводле слоў прадстаўніка ўлад, на борце транспартнага самалёта, які рабіў рэйс па маршруту Тбілісі — Мінеральныя Воды, было больш грузу, чым належыць па правілах перавозкі. Сцвярджаюць, што самалёт нават не паспеў набраць вышыні і ўрэзаўся ў пяціпавярховы жылы дом пашкодзіўшы некалькі паверхаў.

* **Прэм'ер-міністр Ізраіля Рабін і прэзідэнт Егіпта Мубарак сустраліся ўчора ў Каіры. Гэта першая сустрэча кіраўнікоў дзвюх краін за апошнія шэсць гадоў. Чакаецца, што яны абмяркуюць праблемы выхаду з крызісу блізнаўсходніх перагавораў, а таксама прадастаўленне палесцінцам аўтаноміі на акупіраваных Ізраілем тэрыторыях. Сёння да перагавораў Рабіна і Мубарака павінен далучыцца дзяржаўны сакратар ЗША Бейкер.**

* Прэм'ер-міністру Чэхаславакіі Страўскаму афіцыяльна перададзены амаль усе паўнамоцтвы былога прэзідэнта краіны Гавела. Адно — назначаць і адклікаць членаў урада мае права толькі парламент краіны.

* **Паводле даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, кожныя 5 секунд на зямлі чалавек заражаецца СНІДам. Цяпер «хваробай стагоддзя» ў свеце заражана 8—10 мільёнаў дарослых і 1 мільён дзяцей.**

* Раней цяхае пасольства Грэцыі ў Маскве цяпер не пазнаць. Тысячы людзей просяць дазволу на выезд з СНД на радзіму продкаў. У Грэцыі з гэтай нагоды створаны цэнтры па прыёму бежанцаў, але яны ў сілах прымаць 15—18 тысяч у год, а ў СНД жыве амаль паўмільёна грэкаў.

* **Генеральны дырэктар Міжнароднага Алімпійскага камітэта Карар абвінаваціў урад Балгарыі ў парушэннях правоў чалавека пасля таго, як ён забараніў паездку ў Барселону члену МАК І. Слаўкаву. У сваяка Жыўкава адабралі пашпарт пры спробе вылецець з Сафіі ў Барселону. Прычына — Слаўкаў знаходзіцца пад следствам па справе Жыўкава.**

* Былы кароль Румыніі Міхай (ён жыве зараз у Швейцарыі), як паведаміў яго прас-сакратар, вывучае прапанову адной з партый выставіць сваю кандыдатуру на выбарах прэзідэнта ў верасні.

«БІ-БІ-СІ»

* Наследны прынц Югаславіі Аляксандр, які жыве зараз у выгнанні, сказаў, што ў краіну жніўня мае намер прыехаць у сваю краіну на пастаяннае жыхарства, дзе прыкладае ўсе сілы для аднаўлення манархіі. На прэс-канферэнцыі ў Лондане, дзе прынц Аляксандр цяпер жыве, ён сказаў, што аднаўленне манархіі можа дапамагчы канфліктуючым рэспублікам былой федэрацыі пачаць дыялог і стаць на шлях дэмакратыі.

* **У Заходняй Еўропе даўно шукаюць шляхі разбурэння рынку перавозак авіяпасажыраў і тым самым зніжэння цэн на авіябілеты. Яны ў Еўропе ўдвая вышэйшыя, чым у ЗША. Прынята рашэнне аб палётах іншаземных самалётаў на ўнутраных лініях той ці іншай краіны, скажам, англійскіх у Францыі ці Германіі. Лічыцца, што ў выніку шчыльнай канкурэнцыі авіябілеты значна падзешавеюць. Але скептыкі моцна ў тым сумняваюцца.**

* У Англіі забаронены ўвоз пчол, але гэтая мера не выратавала краіну ад нашэсця кляшчоў з Кітая і Расіі, якія пранікілі ўжо ў вуллі мясцовых пчальнікоў. Пэўна, дзікі рой быў завезены ў краіну на караблі. Зараз актыўна распрацоўваюцца метады барацьбы з кляшчом.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ●

З ЗАЛЫ СУДА

«Падвергнуць выключнай меры пакарання...»

ЗЛО ПАВІННА БЫЦЬ ЗАЎСЁДЫ ПАКАРАНА

Дваццаць сёмы год нараджэння Віктар Ладыга сустрэў у турме. Праўда, з гэтай установай ён ужо быў знаёмы раней. Народны суд Шчучынскага раёна ў сакавіку 1983 года прыгаварыў яго да аднаго года папраўчых работ па месцы працы з утрыманнем 20 працэнтаў з заработку. Праз восем месяцаў за чарговае злачынства тым жа судом быў пакараны на тры гады і 6 месяцаў пазбаўлення волі ў папраўча-працоўнай калоніі ўзмоцненага рэжыму.

А вось 28 гадоў з дня нараджэння Віктар Ладыга не сустрэне ніколі... «Улічваючы выключную грамадскую небяспеку ўчыненых злачынстваў, ранейшыя судзімасці за цяжкія злачынствы і ўпартае нежаданне станавіцца на шлях выпраўлення, адхіліць хадайніцтва аб памілаванні Ладыгі Віктара Вячасларавіча, 1964 года нараджэння», — пастанавіў Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у адносінах да асуджанага на выключную меру пакарання—смерць.

...Браты Ладыгі — Віктар і Яўген — працавалі трактарыстамі ў калгасе «Чырвоны сцяг» Шчучынскага раёна. Малодшы Яўген настойліва спасцігаў «мудрыя» павучэнні старэйшага брата, які ўжо загартаваў свой характар у аддаленых месцах. Прыслухоўваўся да яго парад. Ну а як не адклікнуцца на прапанову распіць бутэльку гарэлкі? Ня ма праблем. Якраз на мехдвары сустрэлі яны сваяка —Уладзіміра Ладыгу. Утрох лёгка вялілі пітво. Падалося мала. Хтосьці прыгадаў, што ў вёсцы Быкаўка жыве адзінокая жанчына. За паслугі (напрыклад, пілаванне дроў) шчыра частуе...

Выпіўшы дзве бутэлькі ў хаце гасцінная гаспадыні, прыхапілі з сабой яшчэ літр самагонкі. На матацыкле Віктара дабраліся дамоў, у вёску Варонішкі. Бацькі ўжо спалі. Хлопцы прыселі за стол у летняй кухні. Уладзімір тут жа заснуў. Калі прачнуўся, братоў ужо не было...

Гарэлка штурхала іх да прыгод. На двары цемра, але Ладыгам не прывыкаць калясіць ноччу па ваколіцах. Пасля ўдалага п'янага застолля яны вырашылі наведаць на мехдвор вёскі Балічы — украсці бензін. З вартаўніком В. Яскевічам, здаралася, разам выпівалі. Ведалі, што ў гэты час працуе менавіта ён.

Зрабіўшы праваз у плоце, Ладыгі паціху пранікілі на тэрыторыю. Праз шланг зялілі з бака аўтамашыны «ЗІЛ-130» у прыхопленыя з сабой каністры бензін. Каністру з дваццаццю літрамі малодшы Яўген паспеў вынесці з мехдвара. А вось Віктара з крадзеным убачыў вартаўнік. Паспрабаваў адабраць нарабаванае, затрымаць злодзея.

— Адыдзі, а то дрэнна будзе! — крыкнуў Віктар і ўдарыў Яскевіча кулаком у твар.

Яскевіч упаў. Аднак хутка падняўся, дагнаў злодзея і зноў схапіў за адзенне. Ладыга выкруціўся, падняў з зямлі металічны прут ад гусеніцы трактара і моцна ўдарыў вартаўніка ў грудзі. Некалькі ўдараў прыйшліся па галаве.

Яскевіч скурчыўся, але, сабраўшы сілы, падаўся за злодзеем:

— Я цябе ўсё роўна пасаджу, турэмшчык! — прашаптаў, аблізваючыся крывёй.

Раз'юшаны Ладыга біў без памяці. Яскевіч мёртвы зваліўся на зямлю. Адкінуўшы ўбок металічны прут, Ладыга пайшоў да старой заправачнай, дзе яго чакаў брат.

— Што здарылася? Хто там крычаў? — трывожна спытаў Яўген, гледзячы на пашматаную вопратку Віктара.

— Вартаўніку ўваліў. Відаць, забіў... Трапіўся, падла, насустрач, спрабаваў затрымаць.

— Што фабіць будзем? Заўтра труп могуць знайсці. Ды кроў на тваім адзенні. Лішнія доказы там пакінуў?..

— Не ведаю, давай паглядзім...

Браты вярнуліся на мехдвор, падышлі да таго месца, дзе ў лужыне крыві ляжаў вартаўнік. Памацалі пульс: мужчына быў мёртвы.

— Могуць даведацца, хто забіў. Давай дзе-небудзь схаваем яго, — прапанаваў забойца. Малодшы брат згадзіўся. Удвух аднеслі ў лес спачатку труп, потым — каністры з бензінам.

Віктар вярнуўся дадому, прыгнаў матацыкл. Труп Яскевіча палажылі ў каляску і адвезлі за сем кіламетраў, да Нёмана. Прывязалі да грудзей нябожчыка корпус рэдуктара, да ног — каністру з вадой і скінулі з крутога берага.

Тут жа, на беразе, спалілі шапку Яскевіча, пажоўклым лісцем выцерлі з матацыкла кроў.

Позна ў начы браты вярнуліся дамоў. Ваксай і свіным тлушчам забойца да бляску начысціў боты. Зачышчаў кроў.

...Работнікі крымінальнага вышуку аператыўна выйшлі на след злачынцаў. Зрэшты, апошнія вельмі спяшаліся і крывавых слядоў нарабілі нямала. Ад старой заправачнай сляды матацыкла прывялі сабаку сышчыка ў сасновы бор, па лясных сцяжынках — да абрыву Нёмана. Багром выцягнулі з вады цела Яскевіча.

Судовая калегія Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь пад старшынствам А. Нічыпаровіча прыгаварыла Віктара Ладыгу да выключнай меры пакарання — расстрэлу.

І ўсё ж Ладыга разлічваў, што ў яго застаўся шанц на памілаванне. У хадайніцтве ён піша: «Ні адно пакаранне па сваёй цяжкасці не можа параўнацца з гэтым станам (быць прыгавораным да пакарання смерцю — **Аўт.**), у мяне няма страху перад выкананнем прыгавору. Аб памілаванні прашу таму, што ў гэтым жыцці застаўся адзіны блізкі мне чалавек — мая маці, састарэлая хворая жанчына, якая адчувае патрэбу ў клопатах, дапамозе...»

Як слязліва просіць забойца злітасцівіцца, дараваць злачынства і захаваць жыццё. Але ж чаму так лёгка, без кроплі шкадавання адабраў ён другое жыццё? Тады і пра маці не думаў...

«Калі б не быў п'яны, не пайшоў бы красці, дык і не забіў бы», — тлумачыў следчым прычыну забойства. Калі б!..

Пазней, у прашэнні аб памілаванні, ён цвярджаў: «гэта здарылася таму, што з раніцы дзяцінства быў ахвярай п'янага буйства бацькі... І вырашыў, што агідным паводзінам гэтага чалавека можна процiпаставіць толькі сілу». Знаёмы матыў: вінаваты ва ўсім не я — абставіны.

Няёмка чытаць хадайніцтва аднавяскоўцаў Ладыгі, гатовых усё дараваць. На іх думку, «злачынства тлумачыцца не злосцю і бесчалавечнасцю, а хутчэй страхам і разгубленасцю» — і характарызуецца Ладыга так, што хоць прадстаўляй да ўзнагароды. «Мы жылі побач з ім, ведаем, што ён працавіты, добрасумленны, паважлівы да старэйшых».

Падумалася: няўжо добрае і злачыннае так цесна ўжываюцца ў такім вылюдку? Руку на чалавека Ладыга паднімаў і раней. Неяк у нецвярозым стане ўдарыў гаечным ключом сваяка. У другі раз — кулаком па твары бацьку, выстраліў у яго. Жорсткасць да роднага бацькі перапаўняла яго істоту. Не дзіўна, што не пашкадаваў чужога чалавека. Незадоўга да забойства Ладыга ломам ударыў па галаве намесніка старшыні калгаса, потым з братам білі яго нагамі. Пацярпеўшы, на жаль, дараваў абодвум. Беспакаранасць дала злачынцу «індульгенцыю» на ўсё, нават на забойства.

Меру пакарання ён лічыць занадта строгай, бо судовая калегія «гэтае пытанне вырашыла без уліку прынцыпаў гуманнасці і мэтазгоднасці нашага закона». Мала таго, злачынца настолькі дробязны, што ў скарэе ў Вярхоўны суд патрабуе адмяніць утрыманне з яго 786 рублёў, якія калгас выдаткаваў на пахаванне вартаўніка. Маўляў, яму не прадставілі накладныя на выраб агароджы магілы, не высветлена, з якіх фондаў гаспадарка... аказвала дапамогу.

Аднавяскоўцы Ладыгі, на жаль, маўчалі, хоць і ведалі (а можа, знарок хлусілі следству?), што браты дапускалі шматлікія грубыя парушэнні працоўнай дысцыпліны — спазненні, чнявыхады на работу, заўчасныя адыходы з працы, распіццё спіртных напіткаў на рабочым месцы. Аднак ніякіх мер да іх не прымалася. Такая беспрынцыповасць кіраўніцтва калгаса садзейнічала з'яўленню ў іх пачуцця беспакаранасці, а гэта з'явілася перадумовай цяжкага злачынства

Вераніка КАСТРА:

Я—Марыяна

(Заканчэнне. Пачатак у №№ 140—144).

Каб пра Вераніку Кастра ў Мексіцы не забылі, сталічны музей васковых фігур вырашыў устанавіць у адным са сваіх памяшканняў статую актрысы. Там ужо шмат розных славутасцей ад графа Дракулы да «айца ўсіх народаў» Іосіфа Сталіна.

— Не-не, — смяецца актрыса, — на такую вядомасць я не прэтэндую, але для статуі пазіравала з задавальненнем. Можа, калі-небудзь людзі прыйдуць у музей і ўспомняць пра мяне...

— Але сёння, Вераніка, для мільёнаў гледачоў маёй краіны ваша Марыяна — адзін з самых прыцягальных жаночых вобразаў. І, не сумняваюся, заклапочаныя лёсам герояў «Багатых», яны пакутуюць і гадаюць, чым жа закончыцца ўся гэта гісторыя? Сам я, прызнаюся, цярпець не магу забягаць наперад і, калі гляджу баявік або футбольна-хакейны матч, магу забіць любога, хто рызыкне расказаць мне канцоўку фільма або паведаміць канчатковы вынік. І ўсё-такі, хоць у двух словах, давайце раскажам нашым гледачам, як будзе развівацца сюжэт. Наперадзе ж яшчэ больш ста серый...

— Ну што ж, калі толькі ў двух словах... Загана, як я і абяцала, будзе пакарана, а дабрадзейнасць узнагароджана. Эстэр, канчаткова заблытаўшыся, аслабленая цяжкай хваробай, нараджае ад Дзіега дзяўчынку, але абедзве паміраюць. Перад смерцю ракавая зладзейка раскайваецца і просіць ва ўсіх прабачэння. Паліцыя раскрывае спробы Дзіегі і Ірмы забіць Марыяну і саджае іх у турму. У мексіканскай турме ім будзе не вельмі добра, запэўніваю вас...

Марыяна і Луіс Альберта нарэшце пажэняцца, але на гэтым драматычныя падзеі не заканчваюцца. Зрэшты, лепш няхай аб гэтым раскажа прадзюсер Валянцін Пімштэйн.

— А далей адбываецца вось што, — уключаецца ў гутарку Валянцін. — Луіс Альберта, як высветлілася, страшэнна раўнівы, а яго нястрыманасць гледачам вядомая. Ён адпраўляецца па справах за мяжу, і — трэба ж такому здарыцца! — менавіта ў гэты час Марыяна разумее, што цяжарная. Луіс Альберта з яго сумным вопытам раптам пачынае сумняварца: а ці яго гэта дзіця?.. Між іншым, нельга раскрываць перад гледачамі ўсе сюжэтныя тайны.

Дарэчы, спачатку тэленавела «Багатыя таксама плачуць» была ўдвая карацейшая і павінна была закончыцца вяселлем Марыяны. Ва ўсякім разе, так заканчвалася аповесць кубінкі Інес Радэны, якая жыла ў амерыканскім горадзе Майамі. Да з'яўлення нашай карціны імя гэтай пісьменніцы было вядомае зусім нямногім. Між іншым, і «Тэлевіса» яшчэ не існавала, калі нарадзілася ідэя стужкі.

Гэта было ў сярэдзіне 70-х гадоў. Я тады працаваў на другім канале тэлебачання, які вымушаны быў весці жорсткую канкурэнцыю з іншымі каналамі, каб выжыць. Напружаны творчы пошук прывёў нас да думкі аб тым, каб зняць чарговую тэленавелу ў ЗША.

Тады я і пазнаёміўся з Інес Радэнай. Яе творчасць зацікавіла мяне. Кнігі Інес захапілі той сардэчнасцю і душэўнасцю, якіх часам так не хапае ў жыцці і ў якіх, як мне здалося, мелі патрэбу чытачы і гледачы. Асабліва палюбілася нам адна аповесць, і мы зрабілі па ёй тэлесцэнарый, назваўшы яго «Я спраціла сваё дзіця ў Майамі». Аднак ажыццявіць здымкі ў Майамі нам тады не ўдалося. Каб фэч не прапала, я падрыхтаваў з яе радыёнавелу і яна выйшла ў эфір у Мексіцы.

У хуткім часе пасля гэтага я неяк зайшоў да сваёй знаёмай, вельмі багатай жанчыны. Яна была нечым расстроена. Пакуль я чакаў, калі яна зможа пагутарыць са мной, мімаходзь пачуў размову слуг пра гаспадыню: «Што ж яна плача, у яе ж столькі грошай!». А паколькі я ўсё яшчэ жыў у сваім літаратурным матэрыяле, то раптам падумаў: «Так, грошы зусім не вырашаюць усе людскія праблемы. Вось якую думку нам трэба вылучыць!» Тут жа нарадзілася і назва, але яе трэба было ўзгадніць з аўтарам кнігі. Інес ідэя спадабалася, і калі мы нарэшце пачалі здымкі ў «Тэлевісе», якая ўжо ўзнікла да таго часу, то абышлося без рабочай, як гэта традыцыйна прынята, назвы, а адразу спыніліся на той, пад якой фільм сёння ведаюць ва ўсім свеце: «Багатыя таксама плачуць». Такой вось плённай аказалася выпадкова кінутая фраза.

Тэленавела мела такі поспех, што мы вырашылі прадоўжыць яе, звярнуўшыся да другой аповесці Інес Радэны. Вядомы мексіканскі сцэнарыст Карлас Рамера ўдала злучыў абодва творы, кіраўнікі тэлекампаніі вярнулі акцёраў на здымачную пляцоўку, і таленавіты калектыў «Тэлевісы» захоплена працягваў работу.

Вельмі рады, што «Багатыя» трапілі цяпер і на вашы тэлеэкраны, і, ведаеце, я не здзіўлены, што карціна і ў вас падабаецца, перш за ўсё жанчынам. Упэўнены, што рускія жанчыны таксама, як і мексіканкі, праводзяць усе свае дні ў клопатах, у нялёгкай хатняй рабоце, ды яшчэ адольваючы нягоды сённяшняга цяжкага дня. І ім проста неабходны душэўны адпачынак, прыгожая казка аб усёпераможным каханні.

Я заўсёды адносіўся да вашай краіны з асаблівай сімпатыяй: мае ж бацькі — выхадцы з Беларусі. Яны пакінулі Мінск, ратуючыся ад яўрэйскіх пагромаў. Фонд «Гугенхайм» дапамог ім эмігрыраваць у Чылі. Бацьку было тады 14 гадоў. Сам я ніколі не быў ні ў Расіі, ні ў Беларусі, але ў мяне такое пачуццё, што я неяк звязаны з той далёкай радзімай, з яе людзьмі... Можа быць таму ўсе мае тэлегісторыі некалькі сентыментальныя.

У Мексіку Валянцін Пімштэйн пераехаў у 1951 годзе. Цяпер яму 66 гадоў. У яго жонкі, з якой ён пазнаёміўся тут, таксама расійскія карані. Але і гэта яшчэ не ўсё: дачка Вераніка замужам за чалавекам, чые прабацькі некалі зрабілі той жа шлях — выехалі з Расіі. А зусім нядаўна Валянцін Пімштэйн атрымаў пісьмо з СНД, ад чалавека з аднолькавым прозвішчам. Нейкі Давыд Пімштэйн цікавіўся, ці няма ў іх сваяцкіх сувязей.

— Не ведаю, хоць дакладна сказаць ніхто не можа. Давыд і ўся яго сям'я працуюць на тэлебачанні або нейкім чынам звязаны з ім. Зноў, напэўна, супадзенне? — смяецца Валянцін. — Э-э, не. Гэта ўжо дакладна: агульны лёс.

Сяргей ГАРБУНОЎ.

РАЗБУШАВАЛІСЯ ГАРБУЗЫ

Спякотнае лета і добры паліў станоўча адбіліся на самаадчуванні ўсіх без выключэння гарбузовых культур. Кабачкі даюць прадаўгаватыя жоўта-белыя плады да кілаграма кожны. А гарбузы быццам ачмурэлі: вельмі шмат кветак і завязей. Ад асноўнага сцябла ідуць пасынкі. І на іх фарміруюцца кветкі...

Мэтазгодна пакінуць да трох завязей. Астатнія зрэзаць. Выдаліць і ўсе пасынкі, кветкі, калі яны з'явяцца. Усю энергію трэба накіраваць на развіццё і наліванне пладоў, якія пакінулі.

Прыгадаем, што гарбуз вельмі любіць арганічныя ўгнаенні. Настоі птушынага памёту, каравяку — усё падыдзе. Паліваць і падкормліваць лепш на ноч. У некалькіх месцах можна прыкапаць асноўную плець — там утвараюцца дадатковыя карані. І яны будуць працаваць на ўраджай.

Што будзе, калі вяршыньку асноўнай плеці не адрэжам? Страшнага нічога не здарыцца. Мноства пладоў возьмуць «сваю долю» сілкавання. Усе патроху акажуцца пакрыўджанымі. Самі плады не выспеюць, зярняткі будуць больш пустымі...

Так што выбірайце.

Капусту любяць усе...

Па званках, якія час ад часу гучаць у аддзеле, адчуваецца неспакой людзей за капусту. «Яна нейкая не такая», — так адзначыў адзін з нашых чытачоў.

Давайце прыгадаем, што патрэбна, каб гэта культура расла з ацэнкай «выдатна». Аказваецца, нямала: высокі аграфон і стабільная вільготнасць глебы. Першае дасягаецца ўнясеннем высокіх доз арганічных угнаенняў, другое — своечасовым палівам.

На нашы землі патрэбна даць на квадратны метр да 3—6 кілаграмаў арганікі. Разбежка залежыць ад глебы: на «пустыя» ўнесці поўную меру, акультураныя — менш. І ўсё роўна даваць за вегетацыю дзве-тры падкормкі. Прыкладная доза ў першыя дзве для супясчаных і суглінкаў (на 1 м²): аміячная салетра—30 г, суперфасфату — да 60 г, калію — 30 г. Можна выкарыстоўваць настоі выдзяленняў жывёлы. Напрыклад, паўтара вядра каравяку на бочку вады (200 літраў). Перад падкормкай на кожнае вядро дадаць сталовую лыжку аміячнай салетры (мачавіны крыху менш), па дзве лыжкі суперфасфату і калію. У апошнюю, трэцюю падкормку (на позніх і сярэдняпозніх сартах утвараецца качан) даюць толькі калій — 30 грамаў на вядро ці шклянку попелу. Першыя дзве падкормкі пад корань, апошнюю — у ямкі паміж качанамі.

Пасля дажджу ці грунтоўнага паліву расліны да двух разоў акучваюць.

У капусты шмат ворагаў. Яе вільготнымі, пруткімі лісцікамі, бы цужеркамі, ласуюцца скакучыя, лятаючыя і поўзаючыя шкоднікі. Нападаюць яны ў першую чаргу на слабыя экземпляры, пасля доймуць і лепшыя. Таму за вегетацыю граднікі на саўгасных і калгасных палетках да дзесяці разоў апрацоўваюць рознымі прэпаратамі. На прысядзібных участках гэтага рабіць няма сэнсу. Кладкі яек розных матылькоў, саміх вусеняў лёгка зняць (можна нават нажом). А калі вусені асабліва дапякуць, двойчы апрацаваць плантацыю карбафосам (30 г на вядро вады).

Вельмі надзейна «вартуюць» капусту календула, каляндра, іншыя культуры. Яны выдзяляюць фітанцыды, якія, бы светлазоры, пераводзяць шкоднікаў на іншыя маршруты, проста адважваюць іх. На здымку, які прыводзім, функцыю «вартаўніка» выконвае каляндра.

Збіраем цыбулю і часнок

Жніво настае не толькі ў парнічках і цяплічках, але і на агародзе. Паглядзіце, як змяніла сваю афарбоўку цыбуля. Яшчэ некалькі дзён назад яна была густа-зялёнай, а сёння лісце з нейкімі палоскамі шэрага колеру.

«Змена фарбаў» пачынаецца з кончыкаў пяра. Недзе наогул уся надземная частка расліны ляжыць на зямлі. На яе быццам нехта наступіў.

Часночная градка таксама ў зменах. Яна стала бы ржэўнік. Сцябліны жоўта-залацістыя. Пад іх колер і лісце.

Бяды тут ніякай. Проста надышла пара, калі трэба збіраць ўраджай. Гэты час не ўпускайце, бо расліна, якая не можа засвойваць неабходныя рэчывы для развіцця, лёгка падвяргаецца атакам розных хвароб. Асабліва грыбковых.

Цыбуліны выкопваюць, калі пяро інтэнсіўна набірае шэры, а пасля белаваты колер, сцябло не ў стане трымаць масіўныя стрэлкі і падае. Калі на дзеюх трацях градкі «лягі спаць» сцябліны — час брацца за работу.

Натуральным будзе пытанне: а што рабіць з тымі калівамі, якія яшчэ стаяць? У асноўным, гэта цыбуліны, што далі стрэлкі. Іх у першую чаргу выкапаць і адкласці ўбок — яны захоўваюцца вельмі дрэнна, могуць вам толькі пашкодзіць. Лепш выкарыстаць адразу: нарыхтаваць салату, палажыць у мясныя булёны.

Нармальныя цыбуліны (без стрэлак) з сілай нагнуць да зямлі, каб палягі. Праз тыдзень іх можна выбіраць. Збор ураджаю праводзіцца толькі ў сухое надвор'е. Выбраныя цыбуліны можна раскласці на дзень-два кучамі ў адзін слой на той жа градцы. За гэты перыяд яны падсохнуць, што дасць магчымасць страсці лішак зямлі. Уся далейшая сушка лепш праходзіць на даху з шыфера, чарапіцы, жалеза. Абавязкова выняць рамы ў розных баках, каб гойсаў скразнячок.

Цыбулю ў адзін слой раскладаем на нейкіх шчытах, лістах шыферу, дошках бліжэй да даху. Удзень тэмпература павышаецца да 40—45 градусаў. Гэта якраз тое, што трэба. Вядома, зеленаватыя стрэлкі не абразаем. Час ад часу варушым. Праз два тыдні (здараецца, больш) прадукцыя набудзе таварны выгляд. Яе можна сплятаць у косы, нават абразаць сухое лісце на чатыры-сем сантыметраў ад шыйкі, абрываць карані.

Выкапаны часнок кладуць не на сонцы (як цыбулю), а пад навес, у зацень, дзе ўладарыць вецер. Калі пакінуць на сонцы, ён пачарнее, а долькі могуць стаць нават зялёнымі

Зноў атрасаем ад зямлі—і на гарышча. Побач з цыбуляй часнок будзе адчуваць сябе зусім някепска. Толькі стрэлкі ў часнаку адразаюць, пакідаючы «каленцы» ў пяць-сем сантыметраў. Як і цыбулю, варочаюць. Праз два-чатыры тыдні прадукцыя гатовая.

Многія агароднікі пакідаюць бульбачкі. Капаць часнок у такім выпадку трэба пасля пачатку раскрыцця гэтых бульбачак. Бульбачкі адразаюць з пяньком (20 см), звязваюць у снапкі — і на дах. Знізу падсцілаюць плёнку, паперу, посцілку (зубкі могуць высыпацца).

На здымку: выбраная цыбуля на градцы.

Паглядзім на прышчэпкі

Цяпер не зусім простую справу прышчэпак засвоілі многія. Кожную вясну зразаюцца ў садзе галінкі, каб прыладзіць чаранок новага сорту. Многія ідуць у рост, а гэта гарантыя збору ўраджаю ў будучым.

Што цяпер трэба ведаць, каб неяк палепшыць умовы жыцця новых сартоў. Самае важнае—аслабіць ці зусім зняць ізаляцыйныя стужкі, якімі абгортвалі месца прышчэпкі. Часта яны ўпіваюцца ў кару, парушаюць нармальны рух рэчываў.

Кожны «навічок» імкнецца расці вертыкальна. А вам патрэбна, каб яго накіраванасць была гарызантальнай. Дапамогуць тут розныя кручкі, зачэпы, якімі адгінаем сучкі ўніз, замацоўваем у такім стане. Глядзім, каб аднагадовыя парасткі былі не вельмі гонкімі. Іх нават можна асадзіць, зняўшы вяршыньку на адну-тры пупышкі. Ад гэтага сама новая галінка стане больш тоўстай, значнай.

Паглядзіце, ці не выкінула дрэва побач з прышчэпкай моцны ваўчок. Ён «перахопіць» сілкаванне, якое прызначана для «новенькага». Такі ваўчок лепш за ўсё выразаць.

Наогул, усе непатрэбныя сёлетнія парасткі на яблынях і грушах лепш выразаць летам. «Корм» дастанецца толькі патрэбным галінкам, пупышкам і пладам. Дрэвы ад такой апрацаўкі толькі выйграюць.

Як вызначыць ураджайнасць бульбы?

У розных выданнях агароднікі хваляцца ўраджаямі бульбы да 1.000 цэнтнераў з гектара. Як гэта можна падлічыць? Гектар жа каля хаты ніхто не засявае...

Аляксандр КОЦІКАЎ.

г. Мінск.

Вядома, ніхто. Тут разлік зусім іншы. Аўтары звычайна дадаюць: «што ў пераліку на гектар складае...» Вядома, зручней было б усё звесці да адной соткі. Але многім гэта здаецца дробным. Тут падавай маштабы.

Ураджайнасць можна вызначыць па важкасці бульбін пад кустом. Прыгадаем, што на гектар высаджваецца ў асноўным 50.000 кустоў. На сотку — 500 (шырыня міжрадкоўяў крыху большая за 60 см, адлегласць паміж кустамі — да 30 см). Важаць ураджай з некалькіх кустоў — пяці-сямі. Добрых, сярэдніх і слабых. Выводзіцца сярэдні паказчык. Ён і з'яўляецца арыенцірам у вызначэнні ўраджайнасці.

Напрыклад, вы накапалі з шесці кустоў 4 кілаграмы бульбы. Сярэдняя ўраджайнасць ад аднаго куста — 666 грамаў. Памнажаем гэты паказчык на 500 (колькасць кустоў на сотцы), атрымліваем 333 кілаграмы. Гэта значыць, што «ў пераліку на гектар» у вас 333 цэнтнеры бульбы. Як вядома, зусім не кепскі паказчык.

Можа, хто карыстаецца іншымі крытэрыямі?

Матэрыялы выпуску падрыхтаваў да друку Мікалай ЧАХОЎСКІ (тэл. 32-41-92).

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту М. ГРУШЭЎСКАГА

ДЗЕСЯТЫЯ ЗАДАННІ

Працягваем нашы рэспубліканскія конкурсы рашэнняў пазіцый у рускія шашкі № 92, міжнародныя шашкі № 54 і шашачна-шахматных задач № 3.

РУСКІЯ ШАШКІ

Валянцін Сцяпанаў
(г. Абаза)



Белыя: простыя a5, a7, c1, c3, c5 d2, d4, f6, g1, h2 (10).

Чорныя: простыя a6, c7, d8, e3, e7, f2, f4, g3, g5, h4 (10).

Ход і выйгрыш белых (чатыры ачкі).

МІЖНАРОДНЫЯ ШАШКІ
Пётр Шкудаў
(г. Наваполацк)

Белыя: простыя 24, 25, 29, 30, 32, 33, 37, 38, 39, 40, 46, 48 (12).

Чорныя: простыя 4, 7, 9, 10, 11, 12, 13, 14, 18, 19, 26, 36 (12).

Белыя пачынаюць і выйграюць (чатыры ачкі).

ШАШКІ+ШАХМАТЫ
Аляксей Анулічь
(г. Віцебск)



Белыя: ферзь h2, конь d1, слон c3, пешкі f2, g3, простая шашка в4 (6).

Чорныя: простыя шашкі a5, e5, h4 (3).

Белыя пачынаюць і запіраюць дзве простыя чорных (адно ачко).

ПРААНАЛІЗУЙЦЕ ПАЗІЦЫЮ

Для тых, хто не ўдзельнічае ў конкурсах, прапануем прааналізаваць заканчэнне, якое прыслаў наш чытач з Мсціслаўскага раёна Аляксандр Сапегін.



Белыя: простыя a1, a7, h2, h6(4).

Чорныя: дамка e3, простыя f4, f8, h8 (4).

Ход белых. Ці могуць яны выйграць?

Чакаем вашых аналізаў. Лепшы з іх апублікуем.

НА ДВОР'Е

22 ліпеня

Сёння ўдзень па рэспубліцы пераменная воблачнасць пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ў Віцебску —26—28, Мінску і Магілёве — 27—29, Гродна і Гомелі — 28—30, Брэсце — 29—31 градус цяпла. У наступныя двое сутак: 23-га па паўночнаму захаду, 24-га па ўсходу рэспублікі кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ўначы 14—19, удзень—25—30 градусаў вышэй нуля.

Л. САНКЕВІЧ,
інжынер-сіноптык.

СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ
СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Падборка кароспандэнцый уласнага кароспандэнта «СБ» Канстанціна Северынца, прысвечаная пасяджэнню сайту «Славянскі кірмаш» у Віцебску.

Пад рубрыкай «Эканамічныя драмы» публікуюцца нататкі Уладзіміра Яфанава, тэма якіх —набыццё вытворчымі калектывамі самастойнасці.

Фельетон Васіля Леўчанкі.

«Заканспіраваная гісторыя» — інтэрв'ю Ірыны Гурыновіч з дырэктарам цэнтра імя Ф. Скарыны Адамам Мальдзісам. Тэма размовы — лёс гістарычных і культурных каштоўнасцей, якія апынуліся за межамі Беларусі.

«Зялёная аптэка» — парады традыцыйнай і народнай медыцыны.

Навіны, рэклама.

interfax
ИНТЕРФАКС

Лідэр палітычнай і эканамічнай інфармацыі — агенцтва «Інтэрфакс» сумесна з Маскоўскай таварнай біржай і расійскім Саюзам прамыславікоў і прадпрымальнікаў

ПРАПАНУЮЦЬ УСІМ ДЗЕЛАВЫМ ЛЮДЗЯМ СВАЁ ВЫДАННЕ

«БІРЖАВЫЯ НАВІНЫ»

* 5 разоў на тыдзень—самая аператыўная біржавая інфармацыя па тэлетайпу, факсу, электроннай пошце!

* У нас — сотні падпісчыкаў у дзесятках дзяржаў!

«Біржавыя навіны»—гэта:

* Валютныя, фондавыя, таварныя рынкі ў СНД і краінах Прыбалтыкі.

* Біржавы аналіз, каментарый, прагноз.

☐ КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ ШТОСЬЦІ КУПІЦЬ ЦІ ПРАДАЦЬ
☐ КАЛІ ВАМ НЕАБХОДНА ВЕДАЦЬ СЁННЯШНІЯ ЦЭНЫ НА РОЗНЫХ БІРЖАХ СНД І ЗА ЯЕ МЕЖАМІ —

ВАМ НЕ АБЫСЦІСЯ БЕЗ «БІРЖАВЫХ НАВІН» «ІНТЭРФАКСА»!

Наш адрас: 103006, г. Масква, вул. Цвярская, 32/1.
Тэл. (8-095)-250-92-32; 250-96-37.
Факс (8-095)-250-97-27; 250-89-94.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

22 ліпеня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Крымінальны талент». Маст. фільм. 2-я серыя.
10.15. «Майстэрня». Мастак А. Задорын.
16.30. Навіны.
16.35. Учора, сёння... заўтра? Вілейскі дзіцячы спецінтэрнат.
17.10. Голас. Літаратурна-мастацкі відэаканал для школьнікаў.
18.00. Дак. фільмы.
18.55. Наш каментарый. «Ракеты для аўтарытэту».
19.00. Міжнародны музычны фестываль «Славянскі кірмаш». Фінал. У перапынку **(20.30)**—Калыханка.
21.45. Панарама.
22.10. Відэасалон. «Шлюб італьянску». Маст. фільм (Італія—Францыя).
23.50. НІКа.
24.00. Міжнародны музычны фестываль «Славянскі кірмаш». Джаз уначы.

І канал. Астанкіна

8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.45. Мультфільм.
10.05. Брэйн рынг.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Дзіцячы музычны клуб.
12.00. Свята ў Меліхаве.
13.10. Тэлемікст.
13.55. Блакнот.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. «Гонкі па вертыкалі». Маст. фільм. 3-я серыя.
15.30. Міжнародны музычны фестываль «Славянскі кірмаш».
17.00. Навіны.
17.25. Студыя «Палітыка» паказвае... «Рэпатрыянты».
18.00. «Багатыя таксама плачуць».
18.40. Кінапанарама.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Маст. фільм «Кватэра». 6-я серыя.
21.15. «Чорная скрыня».
21.55. Маст. фільм «За мяжу—патаемна» з серыі «Прыгоды прыватнага сышчыка» (Венгрыя).
23.00. Навіны.
23.25. «Юрмала-92». Начная музычная праграма.
0.25. «Гонкі па вертыкалі». Маст. фільм. 3-я серыя.

Канал «Расія»

8.35. «Залаты Астап». Усерасійскі конкурс гумарыстаў.
8.50. «Шедэўры еўрапейскай музыкі з храма Святога Францыска Асізскага».
9.30. «К-2» прадстаўляе праграмы: «Медыя», «Хто там?», «3, 2, 1» і маст. фільм «Узломшчык».
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
13.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
15.00. Казырная дама.
15.30. «Цвярскі ракурс».
16.05. «Перад лікам Госпада...» М. Цвятаева.
16.30. Там-там—навіны.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Мульці-пульці.
17.15. Далёкі Усход.
18.00. Тварам да Расіі.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Тэлегульня «Лога».
20.00. «Санта-Барбара». Маст. фільм.
20.55. Міжнародны конкурс папулярнай музыкі «Юрмала-92».
22.00. Весткі.
22.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
22.50. Начны акцёрскі клуб.

23 ліпеня

Беларускае тэлебачанне

8.45. «Прыгавораны». Маст. фільм.
16.30. Навіны.
16.35. Для дзяцей. «Папарацькветка». Купалле на Віцебшчыне.
17.05. Мультфільмы.
18.00. «За мірнае неба». Юбілей авіяпалка. Перадача з Брэста.
18.35. «Каб горан не згас». Дак. фільм.
19.00. Абласныя навіны (Гродна).
19.10. Зачытайце маё пісьмо...
19.15. «Фарбы зямлі роднай». «У гарах Урала». Кінанарысы.
19.40. Каралеўскае паляванне. Шоу-казіно. Перадача з Віцебска.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. Закрыццё міжнароднага музычнага фестывалю «Славянскі кірмаш». Гала-канцэрт.

І канал. Астанкіна

8.20. «Багатыя таксама плачуць».
9.45. Кінапанарама.
10.50. Мультфільм.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Дак. фільм.
13.10. Тэлемікст.
13.55. Блакнот.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. «Пункт вяртання». Маст. фільм. 1-я серыя.
15.30. Сёння і тады.
16.00. Разам з чэмпіёнамі.
16.20. Дзіцячы музычны клуб.
17.00. Навіны.
17.20. ...Да 16 і старэйшым.
18.00. «Багатыя таксама плачуць».
18.45. «Лючана Паваропі—падзея».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. Маст. фільм «Кватэра». 7-я серыя.
21.05. Максіма.
21.30. Вячэрні альбом.
22.00. Закрыццё міжнароднага музычнага фестывалю «Славянскі кірмаш».
0.50. «Пункт вяртання». Маст. фільм. 1-я серыя.

Канал «Расія»

9.55. «Чарадзейныя слова гонару». Маст. фільм.
11.05. Непазнаны Сусвет.
11.50. «Санта-Барбара». Маст. фільм.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
15.00. Тэрмінал.
15.30. Мульці-пульці.
15.45. Пілігрым.
16.30. Там-там—навіны.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. «Гэтым летам з Сочы з прывітаннем».
17.45. Праграма «Ключ».
18.00. Парламенцкі веснік.
18.15. Студыя «Нотабене».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Свет спорту вачыма фірмы «Жылет».
20.00. «Экспацэнтр» прадстаўляе.
20.05. Пятае кола.
22.00. Весткі.
22.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
22.50. Міжнародны конкурс папулярнай музыкі «Юрмала-92».

РАДЫ�ё

23 ліпеня

7.00 — «Радыёфакт». 8.15 — «Вясковыя ростані». 9.15 — С. Свірыдаў. «Крык душы». Старонкі аповесці. Перадача 2-я, заключная. 10.15 — для дзяцей. А. Ліндгрэн. «Пэпі Доўгаяпанчоха». Музычны радыёспектакль. Частка першая. 11.00 —«Вы нам пісалі? Адказваем». Перадача па пісьмах. 11.40 —«Чалавек. Грамадства. Закон». 12.00 —«Апоўдні». 13.00 — «У абедзенны перапынак». 14.00 — эстрадная праграма. 15.15 — А. Капусцін. «Каляровая фатаграфія». Апавяданне. 16.05 —«На паваропе». Праграма для юнацтва. 17.00 — «Эканамічны дзённік». 17.40 —«Ад нашага ўласнага кароспандэнта». 18.00 — перадачы абласнога радыё. 19.00 — гуманітарна-інфармацыйны канал радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная». 20.05 — вячэрняя казка. 20.25 — гутарка з намеснікам старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Беларусі, народным дэпутатам В. Сушкевічам. 21.00 — «Ад шчырага сэрца». Музычная праграма. 22.00 —«Клопат». Медыцынскі веснік. 22.10 —«Мы і свет». Міжнародная праграма. 22.30 — «З калекцыі філафаніста». 0.00 —«Начны канал».

Згубленую круглую пячатку «Саюз навукова-вытворчых кааператываў Беларускай ССР. Праўленне саюза» ЛІЧЫЦЬ НЕСАПРАЎДНАЙ.

Здыму кватэру з тэлефонам у Мінску.
Тэл. 46-45-36.

Сумеснае прадпрыемства купіць у Савецкім раёне горада Мінска двухпакаёвую кватэру за СКВ. Тэл. 20-46-17, 20-45-46.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь,
калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, Е. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЦІХАНОВІЧ, С. ШАЎЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда». ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 32-51-05, аддзела пісьмаў — 32-04-52, 32-41-92, навін —32-60-13, даведкі па рэкламе і аб'явах —32-35-91.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.
Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Тыраж 81.096. Індэкс 63.850.
Зак. № 145.
Выходзіць 250 разоў на год.
Нумар падпісаны ў 21.00.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12